Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

№116 (28480)

21 ЧЭРВЕНЯ 2017 г. СЕРАДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

стар. 5–12



Балючыя кропкі АПК

МС



Як харчуюцца ў полі?

МС



З-за чаго беларусы хварэюць?

СТАР. 13

# НАД РАКОЙ ПАЛАТОЙ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Вузкі і доўгі пешаходны мост над вусцем ракі Палата, які звязвае гістарычны цэнтр Полацка з адным з прыватных сектараў горада, рэдка бывае малалюдным.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый КРУПСКІ, начальнік упраўлення эканомікі інавацыйнай дзейнасці Міністэрства эканомікі:**

*«Чакаецца, што ў канцы гэтага года — першым квартале 2018-га выйдзе адкарэкціраваны ўказ №255, па якім будзе аказваецца дзяржпадтрымка для арганізацыі кластарных праектаў. Пры гэтым будуць падтрымлівацца праекты, якія прадугледжваюць фарміраванне перш за ўсё інавацыйна-прамысловых кластараў у высокатэхналагічных галінах эканомікі. Гэта прынцыповая пазіцыя».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.06.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9016 | ▲ |
| Еўра | 2,1203 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0324 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0730 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Жывіце ў бяспецы

## КАЛІ ВАДА — БЯДА

### Як адпачыць без рызыкі для жыцця?

**Сумная вестка прыйшла на выхадных са Столінскага раёна. Група падлеткаў адпачывала каля ракі непадалёк ад вёскі Ямнае. Кампанія разышлася, на беразе засталіся толькі двое — 17-гадовы выпускнік школы і дзяўчына. Хлопец зайшоў у ваду. Але дно там аказалася няроўнае. Плаваць юнак не ўмеў. У нейкі момант ён спаткнуўся і знік пад вадой...**



По стане на 19 чэрвеня вада адабрала жыцці 99 чалавек, у тым ліку 7 непаўналетніх. Уратаваць ад смерці паспелі 81 няўдачлівага плыўца, сярод якіх было 28 дзяцей. А вось папярэджанняў было вынесена шмат — ажно 6634.

— У цэлым па краіне і па Мінску склалася добрая тэндэнцыя па памяншэнні гібелі на вадзе, — кажа **старшыня Мінскай гарадской арганізацыі Таварыства ратавання на вадзе Фёдар КЛЮКАЧ.** — Напрыклад, у 1990-я гады ў Мінску штогод танула 120—130 чалавек. У крайне спякотным 2015 годзе іх было ўжо 63. А летась — 41. Гэтаму зніжэнню спрыяе шчыльная ўзаемасувязь з усімі зацікаўленымі арганізацыямі.

СТАР. 4

■ Працяг тэмы

## «РЭЗАНАНСНАЯ» ЎСТАНОВА

**Публікацыя «Жыльцы супраць «100 грамаў», якая выйшла ў газеце 6 мая, стала рэзананснай. Размова ішла пра «Чарачную» ў жылым доме №18 на вуліцы Чапаева ў Віцебску. Людзей абуралa рэклама піцейнай установы, тое, што яна працуе да 11 гадзін ночы, і не толькі.**




### Непрыемнае суседства

Дарэчы, раней на гэтым месцы знаходзіўся стары жылы дом без «комплексу» камунальных выгод. Пасля зносу некалькіх дамоў на Чапаева, якія не адпавядаюць патрабаванням часу, жыхары, згодна з гарадской праграмай перасялення, атрымалі ключы ад новых кватэр. А на месцах, якія вызваліліся, былі пабудаваныя шматпавярховыя дамы. Сотні людзей павінны быць задаволеныя. Але не...

СТАР. 3

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# Прасунуць адносіны хоць бы на крок

**Такую задачу паставіў Аляксандр Лукашэнка Вышэйшаму дзяржсавету Саюзнай дзяржавы**

**На наступным тыдні адбудзецца пасяджэнне Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы — падзея, важная для абедзвюх краін. З часу мінулага пасяджэння шмат што адбылося, тым не менш, нягледзячы на цяжкасці, народы па-ранейшаму лічаць адзін аднаго брацкімі.**

Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з Дзяржсакратаром Саюзнай дзяржавы Рыгорам Рапотам. Беларускі лідар звярнуў увагу, што склалася добрая практыка «падцягваць» нейкае практычнае мерапрыемства да Вышэйшага дзяржсавета — «гэтага палітычнага і міждзяржаўнага мерапрыемства нашай Саюзнай дзяржавы». Сёлета гэта Форум рэгіёнаў. Падчас яго сустрэнуцца нашы і расійскія губернатары, абмяняюцца думкамі, абмяркуюць праблемы.

— Вы ведаеце, што не было таго выпадку, каб я не прымаў губернатараў Расіі, якія сюды прыязджаюць, — звярнуў увагу Прэзідэнт. — Мы з імі абмяркоўваем тыя пытанні, якія можам вырашыць сумесна, праграмы ў нас — практычна з усімі рэгіёнамі Расіі па развіцці машынабудавання, сельскай гаспадаркі, іншых кірунках. Таму Форум рэгіёнаў — гэта добрае практычнае мерапрыемства.

Так, выстаўка, якая пройдзе ў рамках Форуму рэгіёнаў, пакажа поспехі рэгіёнаў абедзвюх краін.

— Дасягненні, якія перадаюцца ад Расіі да нас, ад нас да Расіі. Мы гэтага не хаваем. Гэта такая форма добрага спаборніцтва, як гэта было ў ранейшыя часы. Гэта вельмі важныя мерапрыемствы. Гэта і сустрэча сам-насам прэзідэнтаў, гэта і шырокі фармат перагавораў, прыняцце рашэнняў.

Павестка дня, дарэчы, ужо сфармулявана.

— Я даўно ўжо не сустракаў такія прапрацаваныя пытанні практычнага характару. Тут і машынабудаванне, і сельская гаспадарка, АПК у цэлым, іншыя праблемы — і палітычнага, і знешнепалітычнага характару. Нам трэба добра падрыхтаваць мерапрыемства, каб яно нас прасунула хоць бы на крок наперад у нашых адносінах у тэме практычнай. Каб была эфектыўнасць ад гэтага мерапрыемства. Думаю, што ў такім кірунку мы зможам падрыхтаваць Вышэйшы дзяржаўны савет.

Рыгор Рапота ў размове з журналістамі пацвердзіў, што падчас сустрэчы з Прэзідэнтам значная ўвага ўдзялялася правядзенню Вышэйшага дзяржсавета Саюзнай дзяржавы. Так, сама па сабе павестка дня дастаткова кампактная, але па сваёй сутнасці яна вельмі важная, таму што там будуць разгледжаны ключавыя пытанні ўзаемаадносін паміж Расійскай Федэрацыяй і Рэспублікай Беларусь. Перш за ўсё, гэта дынаміка гандлёва-эканамічных адносін, развіццё сацыяльнай сферы, захаванне і развіццё машынабудаўнічага комплексу і ўзаемаадносін Расіі і Беларусі ў гэтай сферы.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

# ЯКІ ПАРЛАМЕНТ МАЕМ?

**Кіраўнік дзяржавы сустрэўся са спікерам Палаты прадстаўнікоў**

**Летняя сесія Парламенцкай асамблеі АБСЕ, аптымізацыя ў апараце парламента, а таксама сітуацыя ў раёнах Віцебскай вобласці... Гэтыя пытанні абмяркоўваліся падчас рабочай сустрэчы Прэзідэнта нашай краіны Аляксандра Лукашэнкі і старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзіміра Андрэйчанкі.**

Праз два тыдні ў нашай сталіцы адкрыецца 26-я летняя сесія Парламенцкай асамблеі АБСЕ. Кіраўнік дзяржавы, які пацвердзіў удзел у адкрыцці сесіі, цікавіўся ходам падрыхтоўкі да мерапрыемства:

— Хацеў бы ведаць, наколькі мы гатовы да гэтага. І што я павінен? Гэта значыць, мой кавалак працы. Вы стварылі камісію і павінны былі вызначыць мой удзел у гэтым — каб я мог спланаваць свой рабочы графік.

Безумоўна, цікавіўся кіраўнік краіны і тым, як працуе парламент:

— Парламент новы. Вы — чалавек вопытны. Можаце параўноўваць, рабіць пэўныя вывады... З гэтага пункту гледжання — які парламент сёння мае наша краіна?

Працэсы аптымізацыі адбываюцца і ў Нацыянальным сходзе. Кіраўнік краіны спытаў пра іх ход і звярнуў увагу, што няправільна разумець аптымізацыю як скарачэнне штату:

— Убаку дэпутат не можа стаяць ад гэтага. Таму, натуральна, аптымізацыя закране і парламент. Яшчэ раз хачу паўтарыць: калі нехта разумее аптымізацыю толькі як скарачэнне колькасці — гэта няправільна. Важнае пытанне скарачэння фінансавання, матэрыяльных затрат на ўтрыманне той ці іншай структуры. Вось што такое аптымізацыя. Таму ў гэтай частцы парламент як глядзіцца? Ну і ў вас ёсць яшчэ нейкія пытанні — калі ласка, скажыце мне пра іх.

Асобна Прэзідэнт папрасіў Уладзіміра Андрэйчанку ўдзяляць увагу Віцебскай вобласці:

— Я б вас прасіў у сыходзіць далёка ад роднай вобласці, каб вы бачылі, што адбываецца. Тым больш што вы адтуль дэпутат.

Уладзімір Андрэйчанка расказаў, што прадстаўляе ў Нацыянальным сходзе тры раёны Віцебскай вобласці: Докшыцкі, Глыбоцкі, Ушацкі.

— Што адбываецца ў Віцебскай вобласці: вашы ацэнкі, заключэнні?.. — пацікавіўся Аляксандр Лукашэнка.

## ❍ У тэму

## СТУПЕНЬ ГАТОЎНАСЦІ — ВЫСОКАЯ

**Пазней у размове з журналістамі Уладзімір Андрэйчанка расказаў:**

— Перш за ўсё абмяркоўвалася пытанне правядзення 26-й штогадовай сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ. Як вядома, яна пройдзе з 5 па 9 ліпеня бягучага года. Гэта будзе самае маштабнае міжнароднае палітычнае мерапрыемства ў гісторыі Беларусі. Таму Прэзідэнт паставіў вельмі сур'ёзныя задачы ў плане падрыхтоўкі і годнага правядзення гэтай сесіі. Тэматыка сесіі — умацаванне ўзаемнага даверу і супрацоўніцтва ў імя міру і квітнення ў рэгіёне АБСЕ.

Уладзімір Андрэйчанка звярнуў увагу, што наша дзяржава невыпадкова выбрана месцам правядзення гэтай сесіі. Перш за ўсё гэта атрымалася дзякуючы таму, што наша краіна робіць значны ўнёсак у падтрыманне еўрапейскай бяспекі і ў цэлым праводзіць паслядоўную і прадказальную ўнутраную і знешнюю палітыку.

— Не сакрэт, што сёння асабліва заўважны недахоп даверу — гэта галоўная прычына таго, што краіны не могуць забяспечыць для сваіх людзей такія базавыя каштоўнасці, як мір, стабільнасць і дабрабыт, — заявіў спікер Палаты прадстаўнікоў. — Таму ў цэнтры ўвагі сесіі будуць менавіта гэтыя пытанні, а таксама будзе абмяркоўвацца барацьба з тэрарызмам, арганізаванай злачыннасцю, карупцыяй, сітуацыя ва Украіне, на Блізкім Усходзе.

Адказваючы на пытанне карэспандэнта «Звязды», як прадстаўнікі ПА АБСЕ ацэньваюць ход падрыхтоўкі, Уладзімір Андрэйчанка паведаміў: станоўча.

— Мы спадзяёмся, што сесія будзе накіравана менавіта на зняцце напружанасці, якая сёння існуе паміж дзяржавамі, на ўмацаванне ўзаемнага даверу, а не на канфрантацыю паміж дзяржавамі. Што да падрыхтоўкі, то ў нас пастаянна гэтым пытаннем займаецца сакратарыят Парламенцкай асамблеі АБСЕ. Таму яны ацэньваюць нашу ступень гатоўнасці як высокую. Думаю, тут праблем у нас не будзе.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

## ■ На прыёме

# ПЫТАННІ НЕ РАЁННАГА МАШТАБУ

**У напружаным рэжыме прайшоў суботні прыём грамадзян памочнікам Прэзідэнта па Магілёўскай вобласці Генадзем Лаўранковым у Горках.**

**У гэты ж дзень усе ахвотныя маглі задаць яму свае пытанні і па тэлефоне. З 9 раніцы да 14.00 Генадзь Лаўранкоў паспеў выслухаць 25 чалавек. Большая частка з тых, хто праявіў актыўнасць, былі пенсіянерамі. І амаль усе ўжо звярталіся па дапамогу ў розныя інстанцыі і нават у суд. Але тыя адказы або рашэнні іх не задаволілі. Кожны ўпэўнены ў тым, што яго праблеме не ўдзялялі належнай увагі.**



Некаторыя тэлефанавалі з Быхава, Мсціслаўскага раёна, Магілёва і нават Мінска. Бізнесмен з Мінска паскардзіўся, што яму перашкаджаюць наладзіць вытворчасць інавацыйнай прадукцыі ў Глускім раёне. Прадпрымальнік крыху зацягнуў з адкрыццём вытворчасці — і яго пазбавілі нерухомасці, якую ён дзеля справы купіў на аўкцыёне за адну базавую велічыню. У яго планах было адкрыць некалькі працоўных месцаў для інвалідаў. Ён спадзяецца, што ўмяшанне ў яго справу памочніка Прэзідэнта дапаможа вырашыць праблему. Яшчэ адзін мінчанін паскардзіўся на суседзяў у Горках, з якімі ён і яго брат канфліктуюць з-за зямлі не першы год.

Пенсіянер з Магілёва не задаволены паслугамі мінскай фірмы, якая ўсталёўвала яму і яшчэ двум чалавекам сістэму ачысткі вады. Маўляў, смак вады пагоршыўся, а фірма не хоча скасаваць дагавор і вярнуць грошы.

Некалькі чалавек згадалі чэкі «Жыллё». Жыхарка Горак абурылася, што ёй гэтыя чэкі не далі наогул, а вось ад чэкаў «Маёмасць» ніякай карысці. Яна іх уклала ў нейкае прадпрыемства, але дывідэндаў так і не дачакалася. Яшчэ адна жанчына, якая прыйшла на прыём, са слязамі расказвала, што з-за памылкі ў прозвішчы яе дачка не можа скарыстацца спадчыннымі чэкамі «Жыллё». Памылку можна направіць праз суд, але ў сувязі з тым, што на момант выдачы чэкаў Горацкі райвыканкам быў гарвыканкамам, узніклі складанасці.

Выкладчыца нямецкай мовы паставіла пад сумненне вынікі конкурсу на замяшчэнне пасады па яе профілі, які праводзіла Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія ў 2015 годзе. Справа дайшла да Вярхоўнага суда, але парушэнняў выяўлена не было. Жанчына сцвярджае, што не ўсе факты былі ўлічаны.

У разрад невырашальных трапіла пытанне па вяртанні паявых узносаў, якія былі ўкладзены ў будаўніцтва жыллёвага кааператыва. Яшчэ тры гады таму прынята судовае рашэнне па вяртанні грошай. Але воз і цяпер там. Падчас праверкі гаспадарчай дзейнасці кааператыва былі выяўлены шматлікія парушэнні. Спагнаць грошы немагчыма, паколькі ў забудоўшчыка на балансе нічога няма. Але жанчына спадзяецца, што ёй вернуць 1700 рублёў.

Жыхарка аграгарадка Леніна папрасіла дапамогі па набыццю дарагога медыцынскага абсталявання для яе 5-месячнага сына, у якога сур'ёзнае генетычнае захворванне. Дзіця пакуль знаходзіцца ў абласной бальніцы на апараце штучнага дыхання. Цана пытання — 23 тысячы еўра. Але такіх грошай у сям'і няма, а без апарата дзіця проста не зможа жыць.

Былі таксама пытанні наконт высокай арэнднай платы за жыллё, добраўпарадкавання дарог, рэжыму руху гарадскога аўтобуса, землекарыстання, вулічнага асвятлення, атрымання месца ў дзіцячым садку, заблытанага злачынства, якое дагэтуль не раскрыта...

Усе звароты ўзяты на кантроль, заяўнікі будуць праінфармаваны аб выніках у вызначаны заканадаўствам тэрмін. Генадзь Лаўранкоў адзначыў, што практычна не было тых пытанняў, якія б маглі быць вырашаны на мясцовым узроўні. «Відаць, што выканаўчая ўлада пастаянна і сістэмна працуе з людзьмі, трымае на кантролі іх звароты і, зыходзячы з наяўных магчымасцяў, стараецца іх вырашаць», — падкрэсліў ён.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Міжнародная сустрэча па Сірыі ў Астане пройдзе 4—5 ліпеня

Пра гэта паведаміў кіраўнік прэс-службы міністэрства замежных спраў Казахстана Ануар Жайнакаў. «Чакаецца, што краіны — гаранты рэжыму спынення баявых дзеянняў — Іран, Расія і Турцыя — разгледзяць дакументы, якія рэгламентуюць параметры зон дээскалацыі ў Сірыі, для іх наступнага зацвярджэння, а таксама абмяркуюць пытанні забеспячэння беспярашкоднага гуманітарнага доступу, аднаўлення аб'ектаў інфраструктуры», — удакладніў кіраўнік прэс-службы МЗС.

## Кіруючая ў Індыі партыя вылучыла недатыкальнага кандыдатам у прэзідэнты



Кіруючая ў Індыі партыя «Бхаратыя джаната партыя» вылучыла сваім кандыдатам на будучых прэзідэнцкіх выбарах Рам Натху Кавінду — губернатара штата Біхар, які з'яўляецца далітам, як называюць тут членаў ніжніх кастаў (недатыкальных). Пра гэта паведаміў журналістам яе старшыня Аміт Шах. На думку экспертаў, такое рашэнне дапаможа кіруючай партыі заручыцца шырокай падтрымкай прадстаўнікоў ніжніх кастаў і бедных слаёў насельніцтва. Прэзідэнцкія выбары ў Індыі пройдуць 17 ліпеня.

## У свабодны доступ трапілі асабістыя даныя амаль 200 млн амерыканскіх выбаршчыкаў

Інфармацыйная база аб'ёмам 25 тэрабайтаў была размешчана без абароны паролем у воблачным сховішчы даных, якое належыць кампаніі Amazon. Уцечка інфармацыі была выяўленая экспертам арганізацыі UpGuard, якая займаецца пытаннямі камп'ютарнай бяспекі, Крысам Вікеры. Інфармацыйная база змяшчала імёны і адрасы 198 млн амерыканцаў, гэта значыць больш як паловы насельніцтва Злучаных Штатаў, а таксама ўключала аналітычныя звесткі, атрыманыя метадам камп'ютарнага мадэлявання, аб іх магчымай пазіцыі па тых ці іншых палітычных пытаннях.

## ЕС вырашыў змяніць знешні выгляд шэнгенскай візы

Савет ЕС у мэтах бяспекі прыняў рашэнне змяніць дызайн шэнгенскай візы, каб узмацніць яе абарону ад падробак. Пра гэта гаворыцца ў паведамленні на сайце Савета ЕС. Як чакаецца, у ліпені будзе зацверджаны новы агульны дызайн візавай наклейкі. У Савеце ЕС адзначылі, што дзеючы дызайн, які знаходзіцца ў выкарыстанні ўжо 20 гадоў, быў скампраметаваны сур'ёзнымі інцыдэнтамі з падробкамі і махлярствам.

■ Варта пачуць

# «ЖЫВАЯ КЛАСІКА». ЭКСКЛЮЗІЎНЫ ПРАЕКТ БЕЛАРУСІ

**Конкурс юных чытальнікаў «Жывая класіка» — гэта магчымасць далучыцца да добрай літаратуры, прапушчанай праз дзіцячыя сэрцы. Школьнікі з усёй краіны спаборнічаюць у майстэрстве чытання выдатных твораў беларускіх аўтараў. Сёлета конкурс праходзіць ужо пяты раз. Але толькі ў гэтым годзе ён набыў новыя маштабы — зрабіўся рэспубліканскім — у ім удзельнічаюць прадстаўнікі амаль усіх раёнаў краіны. Ужо падведзены вынікі абласных і мінскага гарадскога этапаў. Пераможцы сустрэнуцца ў фінале, які пройдзе 1 і 2 верасня ў Полацку падчас Дня беларускага пісьменства.**




Фота Надзеі БУЖАН.

Сёлета ўдзел у конкурсе прынялі 13 394 школьнікі з усёй краіны. 606 вучняў спаборнічалі ў абласных адборах. У Полацку ж свае майстэрства прадэманструюць 28 юных чытальнікаў. Яны ўжо атрымалі свой шчаслівы білет — магчымасць наведаць святочныя мерапрыемствы на радзіме першадрукара, паўдзельнічаць ва ўрачыстых школьных лінейках, першых званках у слаўным Полацку. Больш за тое, пераможца прачытае выбраны твор на канцэрце закрыцця свята пісьменства 3 верасня.

Традыцыйна на «Жывую класіку» запрашаюць і пісьменнікаў з іншых краін, якія прыязджаюць на свята, каб на сабе адчуць унікальную атмасферу беларускага слова.

— Дзень беларускага пісьменства — свята з міжнародным розгаласам, — адзначае **намеснік міністра інфармацыі Беларусі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ.** — Сапраўды, пісьменнікі, паэты з іншых краін удзельнічаюць і ў фінальным этапе конкурсу «Жывая класіка», выступаюць у перапынках паміж чытаннямі вершаў дзецьмі. Сёлета чакаем прадстаўнікоў больш чым з дзесяці краін свету: пройдзе традыцыйны міжнародны круглы стол з удзелам замежных і беларускіх пісьменнікаў. Ужо пацвердзілі свой удзел госці з Казахстана, Таджыкістана, Туркменістана, Літвы, Польшчы, розных рэгіёнаў Расіі. Спадзяёмся, што прыедзе вядомы Мар'ян Серватка, былы пасол Славацкай рэспублікі ў Беларусі. Дарэчы, хачу адзначыць, што цяпер у Славакіі, у юбілейны для Янкі Купалы год, выйшла кніга вершаў «А хто там ідзе?», прычым у новых перакладах славацкіх паэтаў. Думаю, што будуць госці з Азербайджана, Арменіі. Усе яны (калі казаць пра ўражанні мінулых гадоў), з захапленнем успрымаюць тую атмасферу «Жывой класікі», якая спалучаецца з удзелам школьнікаў у свяце беларускага пісьменства. Многія гавораць, што гэта эксклюзіўны праект Беларусі.

Адзін з адметных юных чытальнікаў — Багдан Цэхановіч, які скончыў трэці клас школы №2 Мар'інай Горкі, — спецыяльна завітаў у Мінск на сустрэчу з журналістамі, каб прадэманстраваць сваё чытанне ўрыўка паэмы «Новая зямля» Якуба Коласа — і гэта невыпадкова. **Першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена СТЭЛЬМАХ** адзначае:

— Самым папулярным пісьменнікам, якога сёлета чыталі ўдзельнікі «Жывой класікі», аказаўся Якуб Колас. Менавіта да яго твораў найчасцей звярталіся дзеці. А самы папулярны твор (нядаўна споўнілася 110 гадоў з моманту яго напісання) — «Сасновы-распуснік» гэтага ж аўтара. Чые творы яшчэ чытаюць дзеці? Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Змітрака Бядулі, Адама Міцкевіча, Канстанцыі Буйло, таксама сучасных аўтараў Уладзіміра Ліпскага, Алеся Бадака і іншых. Відома, вялікая ўвага ў сёлетнім конкурсе ўдзелена тэме Францыска Скарыны і 500-годдзя айчыннага кнігадрукавання, якое мы адзначаем... Думаю, у конкурсу добрая і светлая будучыня. Ёсць ідэя ў наступным годзе зрабіць яго і конкурсам аўтарскіх вершаў, бо ў дзяцінстве многія захапляюцца і напісаннем. Нашаму Саюзу пісьменнікаў важна падтрымаць творчую моладзь, каб роднае слова жыло.

**Намеснік генеральнага дырэктара тэлеканала СТБ Павел КАРАНЕЎСКІ** адзначыў, што кожны дзень у праграме «Раніца. Студыя добрага настрою» можна ўбачыць і пачуць кагосьці з юных чытальнікаў. Таксама ён падкрэсліў, што для конкурсу ў Полацку, па магчымасці, для кожнага ўдзельніка ствараецца адметны сцэнічны вобраз. Гэта варта ўбачыць.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

■ Траса

# Будуецца транзітны калідор

**Пачатак рэканструкцыі другога ўчастка трасы М6 Гродна — Мінск прайшоў ва ўрачыстай абстаноўцы з удзелам віцэ-прэм'ера Беларусі Анатоля КАЛІНІНА.**

Работы будуць весціся на тэрыторыі Лідскага і Іўеўскага раёнаў — ад 130,4 км да 197,7 км, усяго 67 км трасы. Рэканструкцыю даволі значнага ўчастка забяспечыць холдынг «Белаўтадар», кампаніі якога прызнаны пераможцамі па выніках міжнароднага конкурсу. Дарэчы, за права будаваць дарогу змагаліся кампаніі з 12 краін, у тым ліку Турцыі, Расіі, Кітая, Італіі, Азербайджана. Беларускія дарожнікі паспяхова завяршылі пракладку першага ўчастка трасы даўжынёй 8 км у Шчучынскім раёне (199—207 км). На гэтым участку дарожны рух нядаўна пераведзены на новую паласу. Плануецца, што да канца чэрвеня ўвесь рух на шчучынскім участку (13 км) будзе пераведзены на новую дарогу.

— Выканалі асноўны аб'ём работ і нават працуем з апярэджаннем графіка, — адзначыў на цырымоніі адкрыцця Анатоль Калінін. — Упэўнены, што якасць будзе на высокім узроўні, у нас ёсць дастатковы вопыт работы, у тым ліку за межамі краіны, ёсць тэхналогіі.

Па словах віцэ-прэм'ера, праекты транспартнай інфраструктуры ствараюць умовы для развіцця эканомікі краіны, таму ў Беларусі ім удзяляецца такая ўвага ў апошнія дзве пяцігодкі.

Хуткасную чатырохпалосную магістраль Гродна — Мінск працягласцю 272 км плануецца пабудаваць да канца года, яна будзе мець магутнасць 15 тыс. транспартных сродкаў у суткі. Шырыня палатна складзе амаль 30 метраў. Прадугледжаны бетонныя агароджы на раздзяляльнай паласе, прагоны для дзікіх жывёл, з'явяцца аб'екты прыдарожнага сэрвісу. Траса Гродна — Мінск — гэта асноўная частка праекта па мадэрнізацыі транзітнага калідора «Аўтамабільная дарога М6 Мінск — Гродна — мяжа Рэспублікі Польшча (Брузгі)», які крэдытуецца Сусветным банкам. На дадзены ўчастак адведзена 111 млн долараў. Поўнасцю праект плануецца завяршыць у 2019 годзе.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

# «РЭЗАНАНСНАЯ» ЎСТАНОВА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*




**Фота з сацыяльных сетак, якое прадаставілі жыхары.**

Самыя актыўныя крытыкі чарачнай тыя, што пражываюць у двух пад'ездах недалёка ад яе. Большая частка кватэр — з іншага боку будынка. Карэспандэнт «Звязды» праверыў рэакцыю жыхароў дома на сабе. Пасля таго, як выпіў піва ў той самай чарачнай, стаяў недалёка ад пад'езда. Жаданне выкінуць выкураную цыгарэту ў сметніцу выклікала нервовую рэакцыю дамы з дзіцем. Яна адчыняла дзверы. Бачылі б вы яе вочы! У іх, быццам бы, чыталася: «Дасталі выпівохі, курыльшчыкі!»

Яе пачуцці зразумець можна. Хоць выпіць у «кропцы» харчавання, як і падыхаць паветрам каля яе, нікому не забаронена.

Дарэчы, праблема дрэннай работы вентыляцыі піцейнай установы вырашана. Выцяжную трубу «Чарачнай» знялі з фасада дома пасля сходу жыхароў. У заусучаснай усталявалі кандыцыянер. Калі пахі грамадскай кропкі харчавання перашкаджаюць, уласнікі кватэр могуць звярнуцца ў Віцебскі занальны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі.

## Грошы або камфорт

Нядаўна адбыўся чарговы сход жыхароў дома №18. На сустрэчу прыйшлі прадстаўнікі мясцовай улады і фірмы, якой належыць піцейная ўстанова. Дыялог атрымаўся няпросты. Аргументы «за чарачную» падмацаваныя законам: згодна з яго «літарай», ніякія правы не парушаны. Акрамя таго, горад зацікаўлены ў развіцці малога і сярэдняга бізнесу і папаўненні казны. Падаткі, у тым ліку і ад дзейнасці «Чарачнай», выкарыстоўваюцца для ўборкі і рамонту вуліц, добраўпарадкавання скавераў, пакупкі грамадскага транспарту...

Але, мяркуючы па рэакцыі жыльцоў, яны чакаюць ад уладаў большага разумення. Людзі жадаюць быць пачутымі.

— На жаль, не ўсе разумеюць сэнс нашага пратэсту... Справа не ва ўстанове, а ў яе размяшчэнні! У жылым доме, паміж пад'ездаў! Зусім не хочацца, каб, у першую чаргу, дзеці штодня бачылі на ганку «Чарачнай» і сваіх пад'ездаў п'яных, якія кураць, лаюцца матам, — тлумачыць сваю пазіцыю адзін з жыльцоў.

## Змаганне прадоўжыцца

Жыхары дома вырашылі працягваць барацьбу. Адна сям'я прапанавала зрабіць навакольную тэрыторыю таварыства ўласнікаў свабоднай ад продажу спіртнога і табачных вырабаў. Па прыкладзе месцаў грамадскага прызначэння, многіх паркаў, дзе і курыць забаронена...

Цікава, што незадаволеным жыльцам дома нават у галаву не прыйшло расказаць пра тое, што іх турбуе, свайму дэпутату. Разам з тым у прыёмнай Віцебскага гарадскога Савета дэпутатаў журналісту адразу далі нумар кантактнага тэлефона. Народны выбраннік Вячаслаў Багдановіч (выбарчая акруга №3) пацвердзіў, што да яго выбаршчыкі не звярталіся наконт «Чарачнай». Ён запэўніў, што гатовы з імі сустрэцца, выслухаць і ўнікнуць у сітуацыю. «Гэта нармальная практыка работы з выбаршчыкамі», — заўважыў дэпутат.

Трэба разумець, што законы ствараюцца для людзей, а не супраць іх. Калі інтарэсы бізнесу і простых грамадзян сутыкаюцца, а закон не дапамагае вырашыць канфлікт і напружанне ў грамадстве нарастае, то трэба разабрацца: наколькі закон дасканалы? Магчыма, настаў час нешта ў ім памяняць? Магчыма, пэўную сітуацыю трэба разглядаць індывідуальна, бо закон не можа прадугледзець усе нюансы нашага жыцця.

Сёння на нашых дзяцей звальваецца навала негатыўнай або сумнеўнай інфармацыі з глабальных крыніц, якія даросламу чалавеку цяжка кантраляваць. Сям'я можа супрацьпаставіць ёй лад і ўзаемаразуменне ва ўласным доме. Але калі непадалёк ад гэтага дома перыядычна ляжаць п'яныя наведвальнікі суседняй «кропкі грамадскага харчавання», то зрабіць гэта значна цяжэй.

«Звязда» працягвае сачыць за гэтай гісторыяй.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

■ Прававы лікбез

# Адвакат — не раскоша, а неабходнасць

**Чаму немагчыма стварыць тарыфную сетку на аплату юрыдычнай дапамогі?**

**Адказаць на гэтае пытанне дакладна нельга, бо адвакат аказвае не паслугі, а юрыдычную дапамогу. Важна, да спецыяліста якой кваліфікацыі звяртаецца грамадзянін і якой складанасці пытанне ён вырашае. Часам, каб знайсці адказ, які змесціцца ў адзін сказ, адвакату прыходзіцца некалькі дзён вывучаць нарматыўныя дакументы.**

На кошт паслуг уплываюць стаж працы прафесіянала, складанасць звароту, затрабаванасць канкрэтнага адваката, а таксама геаграфія яго знаходжання: у сталіцы ці маленькім гарадку. Усе гэтыя нюансы з'яўляюцца складнікамі ганарару і вызначаны правіламі прафесійнай дзейнасці адвакатаў.

— Дакладных цэн нідзе няма. У Германіі вызначаны, напрыклад, мінімальныя памеры за пэўныя юрыдычныя дзеянні. А максімум вынікае з дамоўленасці адваката з кліентам. У нас жа пытанне кошту адвакацкіх паслуг вырашаецца дэмакратычна і ў інтарэсах перш за ўсё грамадзяніна, — расказаў **Віктар ЧАЙЧЫЦ, старшыня Рэспубліканскай калегіі адвакатаў.**

Ён адзначыў, што цікавасць да паслуг адвакатаў у беларусаў не вельмі вялікая і, з аднаго боку, гэта добра. З другога — хацелася б, каб пра інстытут адвакатуры больш ведалі і звярталіся па юрыдычную дапамогу на самых ранніх стадыях. Спецыялісты скіраваны на тое, каб аказваць юрыдычную дапамогу задоўга да з'яўлення праблемы. Разам з тым заканадаўствам прадугледжаны шэраг спраў, па якіх грамадзяне могуць атрымаць бясплатную юрыдычную дапамогу. Напрыклад, дапамога па працоўных пытаннях, што разглядаюцца ў судзе, аказваецца выключна сіламі саміх адвакатаў і за іх кошт і не кампенсуецца дзяржавай. Асобы з інваліднасцю вызвалены ад аплаты ўвогуле любой юрыдычнай кансультацыі. Пры гэтым штогод павялічваецца пералік выпадкаў атрымання бясплатнай дапамогі.

— Закон таксама дазваляе (і органы адвакацкага самакіравання актыўна гэтай магчымасцю карыстаюцца) вызваліць любога чалавека ад аплаты юрыдычнай дапамогі, калі грамадзянін знаходзіцца ў цяжкім жыццёвым становішчы. Мне здаецца, такога пераліку спраў, па якіх грамадзяне вызваляюцца ад аплаты адваката, які існуе ў нас, няма ні ў адной суседняй краіне, — мяркуе **Вольга САВІЧ, адвакат Мінскай гарадской калегіі адвакатаў.**

Адвакаты адзначылі, што, як паказвае практыка, часцей за ўсё беларусы звяртаюцца да спецыялістаў права па бытавых пытаннях. Разам з тым адвакатаў засмучае, што па дапамогу рэдка звяртаюцца дробныя прадпрымальнікі, якія працуюць з дакументамі на свой страх і рызыку, пакуль не становіцца позна.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

# Дапамаглі сваёй бальніцы

**Завяршыўся капітальны рамонт у тэрапеўтычным і хірургічным аддзяленнях Глыбоцкай райбальніцы, на фінішы і работы ў дзіцячым аддзяленні.**

Адрамантаваць палаты дзіцячага аддзялення дапамагалі Глыбоцкі камбікормавы завод, мяса- і малочнакансервавы камбінат, а таксама індывідуальныя прадпрымальнікі Дзмітрый Якімовіч і Ігар Гражэўскі, якія закупілі будматэрыялы, аплацілі работу будаўнічай брыгады, купілі свяцільнікі і новую мэблю для дзіцячага блока. Як толькі праектна-каштарысная дакументацыя пройдзе экспертызу, пачнецца рамонт інфекцыйнага аддзялення бальніцы, на які са сродкаў раённага бюджэту выдзелена 430 тысяч рублёў, паведаміў **галоўны ўрач Глыбоцкай цэнтральнай раённай бальніцы Вячаслаў САБЫНІЧ.** Да канца года плануецца завяршыць увесь аб'ём рамонтных работ на аб'екце.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

# КАЛІ ВАДА — БЯДА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пастаянна праводзім і прафілактычную работу, пачынаючы ад дзіцячых садкоў і заканчваючы працоўнымі калектывамі на прадпрыемствах. У апошніх да 2009 года яе амаль не было. Цяпер жа мы прыходзім туды з фільмамі, адкрытымі лекцыямі. Ды і вадалазы расказваюць пра сваю працу.

Больш за ўсё адпачывальнікаў збіраецца ў Мінску. За мінулы год супрацоўнікі Мінскай гарадской арганізацыі Таварыства ратавання на водах выратавалі на сталічных вадаёмах 120 чалавек, з іх 17 непаўналетніх. 18—20 чалавек штогод з іх прыпадае на долю Камсамольскага возера.

**«Мала хто ведае, але існуе і так званае сухое ўтапленне. Яно наступае тады, калі чалавек апусціўся ў ваду і ў яго адбыўся рэфлекторны спазм галасавых звязак. Яны перакрываюць доступ кіслароду да лёгкіх».**

— Нам даводзілася даставаць з вады людзей, у якіх пасля было дыягнаставана моцнае ап'яненне, — згадвае **начальнік выратавальнай станцыі «Камсамольскае возера» Дзяніс ЧАШУН.** — Скажам, 3,8 праміле ці ўвогуле 4,2. Гэта смяротная доза! А ўратаваны зноў лезе ў ваду і крычыць: «Я магу плыць далей! Я майстар спорту па плаванні!» Другая праблема — дзеці. Яны вельмі любяць скакаць у ваду. Але вельмі цяжка ім данесці тое, што да гэтага прайшлі не вельмі добрыя людзі і кінулі ў ваду смецце. А скончыцца гэта можа вельмі цяжкай траўмай. Ды і трэба бацькам кантраляваць, дзе знаходзяцца іх дзеці. Свежы прыклад. Да нас паступіў выклік, што на акваторыі возера тоне дзяўчына. Выехалі, небараку выцягнулі з вады. Сталі распытваць, што ды як. Аказалася, што ёй усяго толькі 14 гадоў. Патэлефанавалі бацькам, каб паведаміць аб здарэнні. А маці кажа: «Дык яна пайшла на дзень нараджэння да сяброўкі і зараз гуляе ў парку!»

Таму мы пастаянна праводзім рэйды разам з супрацоўнікамі Міністэрства ўнутраных спраў. Калі да здаровага сэнсу парушальніка інфармацыю не ўдаецца давесці праз размовы, то даводзіцца рабіць гэта ўжо праз кашалёк. Артыкул 23.63 КаАП «Купанне ў забароненым месцы» прадугледжвае санкцыю ад адной да трох базавых велічынь. На сёння гэта — ад 23 да 69 рублёў.

Шмат адпачывальнікаў імкнецца заплыць за буй. Але мы іх там паставілі не таму, што нам шкада. Па-першае, гэта сігнал таго, што там ужо глыбока. Па-другое, буй размяжоўвае зону для праходу маламерных суднаў. І калі ў сонечнае надвор'е па акваторыі ідзе катар, то яго кіроўцу заўважыць галаву чалавека на вадзе вельмі цяжка, тым больш на хуткасці.

Вельмі важна — даведацца, у якіх вадаёмах купацца можна, а ў якіх у ваду лепш не заходзіць. Як жа атрымаць гэтую інфармацыю?

— Дастаткова зайсці на сайт Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, — раіць **галоўны спецыяліст аддзела арганізацыі медыцынскай абароны пры надзвычайных сітуацыях Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Ігар БАРОЎКА.** — На тытульнай старонцы будзе змешчана паведамленне аб дзяржаўным санітарным наглядзе за станам зон рэкрэацыі. Штопятніцы яно абнаўляецца.

Цяпер абмежавана купанне дзяцей на дзвюх зонах адпачынку. Гэта гарадскі пляж у Нароўлі і пляж «Каскад-1» у Цэнтральным раёне Гомеля. І дзецям, і дарослым не варта выбіраць для воднага адпачынку зону ў Мазыры на левабярэжжы Прыпяці ад аўтамабільнага моста да рэчышча ракі Мерлявіцы.

— Што да дзіцячай смяротнасці, то траўмы і ўтапленні складаюць прыкладна пятую частку, — канстатуе **выконваючы абавязкі загадчыка лабараторыі РНПЦ «Маці і дзіця» Ганна СІМЧАНКА.** — Ад няшчасных выпадкаў за 2016 год загінулі 148 дзяцей. З іх на долю выпадковых утапленняў прыйшлося 25. Я спынюся на фактарах, якія правакуюць патэнцыйны няшчасны выпадак. Гэта асаблівасці дзіцячага арганізма. У дзяцей працэсы нервовай сістэмы — узбуджэння і тармажэння — вельмі лёгка выходзяць з раўнавагі. У малых малодшага ўзросту падчас адпачынку ў спякоту перыядычна дыягнастуецца абязводжанне. На беразе дзеці часта знаходзяцца ў гарачае надвор'е без панамак, пераграваюцца. Таму калі вы вырашылі прыйсці да вады з малым, то стаўце на першы план менавіта яго бяспеку.

— Самая вялікая бяда, з якой мы сутыкаемся ў летні перыяд, — гэта траўмы пазваночніка, якія людзі атрымліваюць падчас ныранне на мелкаводдзі, — зазначае **ўрач-нейрахірург першага нейрахірургічнага аддзялення ДУ «Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр траўматалогіі і артапедыі» Павел БОБРЫК.** — Як правіла, гэта людзі ва ўзросце да 35 гадоў, якія знаходзяцца ў самым росквіце сіл. А вымушаны пасля здарэння перасаджвацца на інвалідную каляску... Чацвёра з пяці людзей, якія атрымалі траўму пазваночніка шыйнага аддзела і спіннога мозгу, знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення. У 95% з паступаючых да нас у Цэнтр траўмы звязаны з пашкоджаннем спіннога мозгу.



**«Шмат адпачывальнікаў імкнецца заплыць за буйкі. Але мы іх там паставілі не таму, што нам шкада месца. Па-першае, гэта сігнал таго, што там ужо глыбока. Па-другое, буй размяжоўвае зону для праходу маламерных суднаў. І калі ў сонечнае надвор'е па акваторыі ідзе катар, то яго кіроўцу заўважыць галаву чалавека на вадзе вельмі цяжка, тым больш на хуткасці».**

На базе Цэнтра створана адмысловая выязная брыгада. У ёй кругласутачна дзяжураць урач-нейрахірург і кіроўца. Колькасць выклікаў прама прапарцыянальная росту тэмпературы паветра. Бывае так, што за дзень даводзіцца выязджаць у 5—7 пунктаў.

— Людзі, якія ныраюць уніз галавой, не ведаюць, што ў шыйным аддзеле пазваночніка ёсць і спінны мозг, — працягвае Павел Бобрык. — На моц яны яго выпрабоўваюць раз, другі, трэці, пакуль іх без руху ў канечнасцях не выцягваюць ратавальныя службы. Напрыклад, з 350 выклікаў у нас за год 90 звязаны з пашкоджаннем шыйнага аддзела пазваночніка. Калі ж адбыўся разрыў спіннога мозгу — гэта сапраўдная катастрофа. І шанцы на паўнавартаснае аднаўленне функцый блізкія да нуля.

Але ў вадзе могуць падсцерагаць і іншыя непрыемныя сітуацыі. Пра іх расказаў **намеснік начальніка ўпраўлення судова-медыцынскіх экспертыз ДКСЭ па горадзе Мінску Уладзімір СЕМЯНКО-БАЯРЫНЦАЎ.**

— За 27 гадоў, якія я адпрацаваў у медыцыне, «сезон» масавых утапленняў заўжды пачынаецца ў сакавіку і доўжыцца ажно да кастрычніка. І амаль усе смяротныя выпадкі звязаны з алкагольным ап'яненнем. Кампаніі выязджаюць на бераг, адзін смяльчак адкрывае сезон — і ўсё... Мала хто ведае, але існуе і так званае сухое ўтапленне. Яно наступае тады, калі чалавек апусціўся ў ваду і ў яго адбыўся рэфлекторны спазм галасавых звязак. Яны перакрываюць доступ кіслароду да лёгкіх. А пры апусканні ў халодную ваду можа адбыцца і рэфлекторнае спыненне сэрца. Таму трэба пачакаць, пакуль вада нармальна прагрэецца, і толькі пасля ісці купацца. Што асабліва важна гэтым летам...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Реммех», 220024, г. Минск, ул. Бабушкина, 48. Тел. +375 (17) 291-83-47 |

**Предмет аукциона**

**Транспорт, спецтехника и оборудование, расположенные по адресу:** г. Минск, ул. Бабушкина, 48, в составе:

| № лота | Инв. номер | Наименование | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 1 | - | **Трактор Т-170Б** | 10 325,00 | 516,25 |
| 2 | 10024 | **Ножницы гильотинные НА 3225** | 15 156,12 | 757,81 |
| | 1112323 | **Тележка под гильотину с путями S32** | | |
| | 4194 | **Установка роликовая для резки** | | |
| 3 | 4211 | **Пресс-ножницы 3Н5222** | 2 261,70 | 113,09 |
| 4 | 5160 | **Сварочный полуавтомат JackleMIG 326 G** | 926,10 | 46,31 |
| 5 | 5158 | **Сварочный полуавтомат JackleMIG 500TS** | 1 102,50 | 55,13 |
| 6 | 999968 | **Полуавтомат Powertec 250C** | 355,32 | 17,77 |
| 7 | 999969 | **Полуавтомат Powertec 250C** | 355,32 | 17,77 |
| 8 | 1018 | **Полуавтомат Powertec 250C** | 426,30 | 21,32 |
| 9 | 10022 | **Полуавтомат Powertec 300** | | 23,52 |
| 10 | 5077 | **Сверлильный станок 2Н135** | 790,44 | 39,52 |
| 11 | 4071 | **Станок токарно-винторезный 16 в-20** | 4 456,20 | 222,81 |
| 12 | 4035 | **Универсальный трубогибочный механизм ТГС-5** | 1 206,24 | 60,31 |
| 13 | 4591 | **Контейнер металлический, 2014 г.в.** | 130,20 | 6,51 |
| 14 | 41000001 | **Станок радиально-сверлильный 2Н55Ф2, 1971 г.в.** | 3 990,00 | 199,50 |
| 15 | 5169 | **Станок сверлильный 2М-118 (2Н 155), 1990 г.в.** | 394,80 | 19,74 |
| 16 | 50 | **Станок заточной 3А64Д, 1972 г.в.** | 2 142,00 | 107,10 |
| 17 | 4032 | **Станок точильно-шлифовальный ТШ-3, 2006 г.в.** | 197,40 | 9,87 |
| 18 | 221 | **Станок универсально-заточной 3М-642, 1986 г.в.** | 2 226,00 | 111,30 |
| 19 | 4380 | **Обогреватель переносной Master BV 170 E** | 690,00 | 34,50 |

**Изолированные помещения** в составе:

| № лота | Инв. номер | Наименование (назначение) | Общая площадь | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| 20 | 500/D-708145927 | **Административное помещение** | 402,5 кв. м | г. Минск, ул. Бабушкина, 48-5 |
| | Начальная цена с НДС 20% – **104 357,40 белорусских рублей**; Шаг аукциона – **5 217,87 белорусских рублей** | | | |
| 21 | 500/D-708145928 | **Административное помещение** | 402,8 кв. м | г. Минск, ул. Бабушкина, 48-6 |
| | Начальная цена с НДС 20% – **90 656,30 белорусских рублей**; Шаг аукциона – **4 532,82 белорусских рублей** | | | |
| 22 | 500/D-708145929 | **Административное помещение** | 408,9 кв. м | г. Минск, ул. Бабушкина, 48-7 |
| | Начальная цена с НДС 20% – **91 994,95 белорусских рублей**; Шаг аукциона – **4 599,75 белорусских рублей** | | | |

**Ремонтно-механическая мастерская, оборудование и иное имущество, реализуемое одним лотом:**

| № лота | Наименование (назначение) | Общая площадь | Инв. номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| 23 | **Ремонтно-механическая мастерская** (Помещение неустановленного назначения) | 3401,4 кв. м | 500/D-708182365 | г. Минск, ул. Бабушкина, 48/ 1- 2 |

**С перечнем оборудования и иного имущества, входящего в состав лота,** можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by

**Начальная цена с НДС 20% – 996 081,26 белорусских рублей**
**Шаг аукциона – 49 804,06 белорусских рублей**

| | |
|---|---|
| **Обременения по лотам №№21–25** | Арендаторы. Подробная информация на сайте организатора аукциона |

**Объекты недвижимого имущества, в составе:**

| № лота | Наименование (назначение) | Общая площадь | Инв. номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| 24 | **А 4/к-кп. Здание котельной** (Здание специализированное энергетики) | 1758,0 кв. м | 500/ С-27612 | г. Минск, ул. Бабушкина, 48 |
| | **Станция для перекачки конденсата литер М1/К** (Сооружение специализированное коммунального хозяйства) | 5,5 кв. м | 500/ С-47974 | г. Минск, ул. Бабушкина, 48 |

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельном участке** | Земельный участок предоставлен Продавцу на праве аренды (срок действия договора по 2049 г.) с общ. пл. **1,1998 га** для эксплуатации и обслуживания здания специализированного энергетики (здание котельной) и здания неустановленного назначения (здание котельной) (установленные ограничения: охранная зона водопровода, площадь 0,1228 га, охранная зона газопровода, площадь 0,0650 га) |
| **Обременение** | Арендаторы. Подробная информация на сайте организатора аукциона |
| **Начальная цена с НДС 20%** | **240 912,00 белорусских рублей** |
| **Шаг аукциона** | **12 045,60 белорусских рублей** |

**Здание контрольно-пропускного пункта**:

| № лота | Наименование (назначение) | Общая площадь | Инв. номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| 25 | **Здание контрольно-пропускного пункта** (Здание специализированное иного назначения) | 201 кв. м | 500/ С-28266 | г. Минск, ул. Бабушкина, 48 |

| | |
|---|---|
| **Составные части и принадлежности** | Ворота металлические откатные, ограждения (железобетонное, металлическое), площадки (асфальтобетонное, бетонное, плиточное покрытия), площадка под оборудование (бетонное покрытие) |
| **Сведения о земельном участке** | Земельный участок предоставлен Продавцу на праве аренды (срок действия договора по 2051 г.) с общ. пл. **0,7151 га** для эксплуатации и обслуживания административно-бытового здания, здания ФОКа, здания КПП, здания неустановленного назначения |
| **Обременение** | Арендаторы. Подробная информация на сайте организатора аукциона |
| **Начальная цена с НДС 20%** | **136 011,60 белорусских рублей** |
| **Шаг аукциона** | **6 800,58 белорусских рублей** |

**С подробной информацией по предметам аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона** WWW.CPO.BY

| | |
|---|---|
| **Порядок ознакомления** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется во вторник, среду и четверг с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Расолько Александр Александрович, главный энергетик, контактный телефон МТС 80295702184 |

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с 3012343260010; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты: по лотам №№1–19** не более **10 (десяти) дней** со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.
**По лотам №№20–25** не более **30 (тридцати) дней** со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. №16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **WWW.CPO.BY**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5%

**Затраты** на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона по лотам №№1–23 опубликовано в газете «Звязда» 01.06.2017 г., по лотам №№24–25 в газете «Звязда» 13.05.2017 г.

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **06.07.2017** в 15.00 по адресу: **г. Минск, ул. Бабушкина, 48, актовый зал, ОАО «Реммех»** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **04.07.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
21 чэрвеня 2017 г.
№22 (406)



стар. 4

Гаспадар адказвае за ўсё



стар. 5

Вырошчваем вешанкі... дома



стар. 6

Дзе знайсці дэпутата

ТЭМА ТЫДНЯ

# НЯПРОСТАЯ АРЫФМЕТЫКА АПК

***Як сельгаспрадпрыемству выйсці на прыбытак? Па адказ на гэта пытанне члены Савета Рэспублікі выехалі ў Кіраўскі раён***



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

*Аграгарадок Мышкавічы.*

**Сучасным прадпрыемствам у аграпрамысловым комплексе працаваць не вельмі проста. У дадатак да таго, што яны існуюць у сучасных эканамічных умовах і церпяць, як і ўсе, наступствы крызісных хваляў, сельская гаспадарка залежыць і ад такіх малапрагназуемых рэчаў, як надвор'е, эпідэміі сярод жывёл, забароны на пастаўку ад замежных партнёраў. Відавочна, не кожная гаспадарка аднолькава эфектыўна можа тэрмінова вырашыць усе пытанні. Падчас выязнога пасяджэння Пастаянная камісія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні наведала адзін з перспектыўных сельскагаспадарчых кааператываў у Кіраўскім раёне і паспрабавала высветліць, як вырашыць праблемы астатніх.**

## ХТО ПАДЫМАЕ ГАСПАДАРКУ?

У аграгарадку Мышкавічы знаходзіцца ААТ «Рассвет» імя К.П. Арлоўскага. Прадпрыемства легендарнае. Герой Савецкага Саюза Кірыл Арлоўскі, ураджэнец гэтага мястэчка, у час вайны ў тыле ворага камандаваў партызанскімі атрадамі і дыверсійнымі групамі. У 1944 годзе ён даслаў пісьмо Сталіну, у якім папрасіў накіраваць яго на малую радзіму ў якасці кіраўніка калгаса. Ён распрацаваў, як бы мы цяпер сказалі, бізнес-план, як падняць сельскую гаспадарку ў раёне за пяць гадоў. І ў яго атрымалася. Калгас «Рассвет» стаў першым у СССР, які пасля вайны атрымаў мільённы прыбытак.

стар. 3

НАВУКОВЫ ПАДЫХОД

# НА ПАЛЕТКІ ПРЫЙДУЦЬ... КАМП'ЮТАРЫ



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Зрабіць сельгасмашыну беражлівай

**Не сакрэт, што развіццё сельскай гаспадаркі сёння больш за ўсё абумоўлена выкарыстаннем у ёй інавацыйнай тэхнікі. Калі раней рост вытворчасці забяспечваўся прыцягненнем большай колькасці работнікаў, то сёння на першы план выходзіць якаснае і высокапрадукцыйнае абсталяванне, для работы якога не трэба мець велізарны штат спецыялістаў. Апроч буйных прадпрыемстваў, такіх як МТЗ ці «Гомсельмаш», тэхніку для аграрыяў распрацоўвае навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па механізацыі сельскай гаспадаркі. Карэспандэнты «МС» сустрэліся з намеснікам генеральнага дырэктара гэтай установы па ўкараненні і выпрабаваннях Дзмітрыем КОМЛАЧАМ і пагутарылі пра дасягненні і праблемы айчыннага АПК.**

***— Якія з найноўшых распрацовак цэнтра вы лічыце найбольш значнымі?***

— За апошнія тры гады мы ў асноўным сканцэнтраваліся на машынах для глебаапрацоўкі і пасеву. Гэта, напрыклад, абаротны дванаццацікорпусны плуг, які ўжо прайшоў дзяржаўныя прыёмачныя выпрабаванні і рыхтуецца для серыйнай вытворчасці. Ён прызначаны для работы з магутнымі трактарамі пятага класа (вышэй за 400 конскіх сіл) і мае модульную канструкцыю па схеме «восем плюс чатыры», што дазваляе зменшыць плошчу апрацоўкі, калі гэта патрэбна. Машына адпавядае ўсім сучасным патрабаванням да такой тэхнікі: абаронена ад камянёў, мае высокі рэсурс выпрацоўкі. Акрамя гэтага, плуг не толькі ўзорвае глебу, але і крышыць яе — значыць, адразу пасля праходу можна пускаць сеялку.

Дарэчы, яшчэ адна распрацоўка — гэта якраз сеялка прамога пасеву з шырынёй захвату дзевяць метраў, вельмі магутная машына, якая дазваляе сеяць збожжавыя непасрэдна ў іржышча без апрацоўкі глебы. Яна таксама ўкамплектавана спецыяльным абсталяваннем, якое дазваляе ўносіць мінеральныя ўгнаенні.

Акрамя гэтага, распрацавалі цэлы шэраг уборачнай тэхнікі: камбайны для ўборкі ягад (пераважна кустовых культур: араніі, парэчак, агрэсту), морквы, капусты, самаходную машыну для збору садавіны і фруктаў. Апошняя распрацоўвалася па даручэнні кіраўніка краіны, яна неабходна для беражлівай работы з семечкавымі культурамі, у прыватнасці яблыкамі, грушамі.

стар. 5

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## ПАДАТКІ ПАВЫШАЦЦА НЕ БУДУЦЬ

**Аб гэтым заявіў старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір ПАНЦЮХОЎ па выніках пасяджэння Прэзідыума Савета Міністраў.**

Сярод пытанняў сустрэчы — канцэпцыя прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця дзяржавы на 2018 і да 2020 года, мерапрыемствы комплекснага плана развіцця электраэнергетычнай сферы Беларусі да 2025 года, а таксама бюджэтна-фінансавая палітыка краіны на 2018 год.

— Сцэнарый развіцця беларускай эканомікі — кансерватыўны, ён прадугледжвае збалансаванасць зыходзячы з росту заработнай платы і прадукцыйнасці працы. Такі сцэнарый дазваляе выйсці на тыя параметры, якія прагназуюцца да 2018 года, — адзначыў член Савета Рэспублікі. — Па выніках значнага абмеркавання бюджэту было прынята рашэнне зноў разгледзець гэтае пытанне праз некалькі тыдняў, да канца жніўня скончыць напрацоўку бюджэту 2018 года, а пасля гэтага выйсці з прапановай да кіраўніка дзяржавы.

Па словах Уладзіміра Панцюхова, у аснову вызначэння бюджэту было пакладзена забеспячэнне макрафінансавай збалансаванасці і захаванне параметраў фінансавай бяспекі. «Акрамя таго, на пасяджэнні было вырашана выконваць мараторый на павышэнне падатковых ставак і ўвядзенне новых падатковых збораў», — дадаў сенатар.

## ПЫТАННІ З АНГЛІЙСКІМ АКЦЭНТАМ

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, кіраўнік рабочай групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентам Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі Алег РУМО прыняў удзел у сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі ў нашай краіне Фіёнай Гіб.**

На працоўнай нарадзе таксама прысутнічалі старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Андрэй Навумовіч і намеснік начальніка ўпраўлення Усходняй Еўропы і Цэнтральнай Азіі Міністэрства замежных спраў Вялікабрытаніі Джэніфер Макнотан.



Адной з цэнтральных тэм сустрэчы стала праблематыка смяротнага пакарання, удзельнікамі былі разгледжаны двухбаковыя мерапрыемствы па гэтым пытанні. Акрамя таго, бакі абмеркавалі патэнцыйнае пашырэнне ўзаемадзеяння паміж парламентарыямі дзвюх дзяржаў, а таксама магчымасць арганізацыі сустрэчы ў рамках 26-й штогадовай сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ, якая адбудзецца ў беларускай сталіцы з 5 па 9 ліпеня 2017 года.

## КУЛЬТУРНАМУ САЮЗУ — БЫЦЬ

**Падпісаны Мемарандум аб стварэнні Еўразійскага культурнага саюза.**

Дакумент з'явіўся па выніках працы II Міжнароднага форуму кіраўнікоў музычных установаў краін Шаўковага шляху «Вялікі шаўковы шлях: узаемадзеянне культур Захаду і Усходу», які праходзіў у рамках Міжнароднай выставы «ЭКСПА-2017» у Астане. Дзякуючы гэтаму дакументу палепшыцца ўзаемадзеянне міжнародных арганізацый еўразійскіх дзяржаў, яшчэ большая ўвага будзе ўдзелена развіццю нацыянальных культур.

У форуме прыняла ўдзел **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Кацярына ДУЛАВА**. Беларускі парламентарый зрабіла выступленне на тэму «Захаванне і пераемнасць музычнай спадчыны — вопыт вышэйшых навучальных устаноў мастацтва». На форуме кіраўнікі музычных устаноў розных краін расказалі аб уласных дасягненнях у галіне культуры і адукацыі.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

# АПОРА АДНА — ЭНТУЗІЯЗМ ЛЮДЗЕЙ

## Што такое КОТГС і як гэта насамрэч працуе

**З кожным годам у Беларусі з'яўляецца ўсё больш неабыякавых людзей, якія жадаюць бачыць свой двор дагледжаным, пад'езд — чыстым, а лавачкі — пафарбаванымі. Калі вы пазналі ў гэтых словах сябе, то вам варта паспрабаваць свае сілы ў КОТГС — калегіяльным органе тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. Менавіта эфектыўнасць гэтага органа абмеркавалі на апошнім сумесным пасяджэнні ў Мінску ўдзельнікі Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце і пастаяннай камісіі Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў мандатнай, па галоснасці, самакіраванні, правапарадку і міжнародных сувязях.**



Калегіяльны орган тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання — гэта група людзей, якія неабыякава ставяцца да жыцця свайго раёна і ўсімі сіламі спрабуюць палепшыць навакольную тэрыторыю.

Якія пытанні можа вырашыць гэты орган? Любыя, звязаныя з канкрэтна вашым жылым раёнам. Калі санітарны стан вашага пад'езда выклікае пытанні, калі побач з вашым домам пастаянна непрыбрана — арганізацыя ў гэтым можа разабрацца. Акрамя таго, удзельнікі і актывісты КОТГС падтрымліваюць сацыяльна неабароненыя катэгорыі грамадзян, маюць зносіны з мясцовымі ўчасткавымі, а таксама могуць арганізаваць розныя мерапрыемствы — напрыклад, свята двара ці конкурс на лепшы кветнік.

Адразу з'яўляецца пытанне — адкуль столькі паўнамоцтваў? Гэты орган актыўна супрацоўнічае з рознымі службамі і арганізацыямі — адміністрацыяй раёна і сацыяльнай службай, жыллёва-камунальнай гаспадаркай і мясцовай школай, грамадскімі арганізацыямі і многімі іншымі. Навошта яму гэта трэба? Усё проста: лепш за ўсё аб праблемах раёна ведаюць людзі, якія ў ім жывуць. Таму дзяржава, згодна з законам аб мясцовым кіраванні і самакіраванні, надзяліла КОТГС магчымасцю вырашаць праблемныя моманты.

Прадстаўнікі ўлады на мінулым выязным пасяджэнні пазнаёміліся з работай аднаго з найбольш актыўных і пасляховых органаў, якім з'яўляецца сталічны КОТГС-59 Савецкага раёна. Па словах яго **старшыні Уладзіміра УСЦІНОВІЧА**, кола пытанняў, па якіх працуе арганізацыя, надзвычай шырокае. «План работы на год вызначаецца на падставе анкетавання жыхароў раёна, — адзначыў ён. — Сёння сярод актуальных пытанняў можна вылучыць наступныя: тэхнічнае абслугоўванне жылых дамоў, добраўпарадкаванне двароў, паркоўка транспарту і выгул сабак у дварах».

На думку старшыні, такая форма ўзаемадзеяння грамадства і дзяржавы, як КОТГС, сапраўды жыццяздольная. «Бо мы не толькі дагледаем двор, але і актыўна ўзаемадзейнічаем з гарадскім аддзелам міліцыі, разам імкнёмся ўтаймаваць наркаманаў, хуліганаў і дэбашыраў, — падкрэсліў Уладзімір Усціновіч. — Стараемся таксама дапамагчы людзям, якія пакінулі месца зняволення, знайсці работу».

Дзякуючы сур'ёзным адносінам з боку міліцыі актывістам органа ўдалося нават раскрыць 5 злачынстваў. Больш за тое, з дапамогай удзельнікаў КОТГС затрымалі гвалтаўніка, які аказаўся рэцыдывістам. «Усё дзякуючы ўсталяваным на тэрыторыі раёна камерам назірання», — дадаў старшыня.

На жаль, сёння цэнтральнай праблемай гэтых органаў з'яўляецца не надта вялікая колькасць зацікаўленых у такой дзейнасці людзей. «Але я лічу, што ў кожным доме ёсць актывісты, проста ім трэба паказаць, што такая форма працуе», — упэўнены Уладзімір Усціновіч.

— Усё залежыць толькі ад грамадзян, — лічыць **старшыня пастаяннай камісіі Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў мандатнай, па галоснасці, самакіраванні, правапарадку і міжнародных сувязях Георгій АТАМАНАЎ**. — Але, акрамя гэтай, ёсць і іншыя праблемы. На жаль, у краіне так і не рэалізавана палажэнне закона аб стварэнні нацыянальнай асацыяцыі Саветаў дэпутатаў, а сама прававая форма не дае адказаў на практычныя пытанні. Таксама неабходна сістэмнае і комплекснае прававое рэгуляванне органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. Трэба канкрэтызаваць парадак узаемадзеяння такога інстытута і органаў дзяржаўнай улады пры вырашэнні пытанняў мясцовага значэння.

Па выніках сустрэчы было вырашана актывізаваць работу паміж органамі тэрытарыяльнага грамадскага кіравання, мясцовымі Саветамі дэпутатаў, выканкамамі і адміністрацыямі па прыняцці рашэнняў мясцовага значэння. Акрамя таго, у будучым магчыма прыцягненне органа да ўдзелу ў пытаннях гандлю, грамадскага харчавання, транспартнага і бытавога абслугоўвання, аховы здароўя і сацыякультурнай сферы.

У канцы пасяджэння **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Леанід ЦУПРЫК** падкрэсліў, што сёння сістэма органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання працуе, няглядзячы на некаторыя недакладнасці. «Пакуль выніковыя рашэнні нашага пасяджэння маюць агульны характар, паколькі ўсе прапановы патрабуюць вельмі сур'ёзнага і ўзважанага падыходу, — адзначыў Леанід Цупрык. — Іншая справа, што сёння гэта ўсё ў асноўным трымаецца на энтузіязме і актыўнай грамадзянскай пазіцыі людзей. А як палепшыць сітуацыю — гэта ўжо абсалютна новае пытанне».

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

# Ачыстка — на рэканструкцыі

**У Брэсце распачалася маштабная рэканструкцыя гарадскіх ачышчальных збудаванняў. Пра важнасць рэалізацыі міжнароднага інвестыцыйнага праекта пад назвай «Беларусь: экалагічны інфраструктурны праект — 1-ы этап, рэканструкцыя ачышчальных збудаванняў каналізацыі г. Брэста» гаворыць нават той факт, што перад пачаткам работы адбылася цырымонія закладкі сімвалічнай капсулы для нашчадкаў.**

Фінансаванне праекта ажыццяўляецца за кошт крэдытаў і грантаў міжнародных арганізацый. Мэтай рэканструкцыі вызначана дасягненне паказчыкаў ачысткі сцёкавых водаў агульнаеўрапейскіх экалагічных стандартаў. Падчас урачыстай закладкі капсулы **старшыня гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК** адзначыў, што гэтая работа ўяўляе сабой цудоўны прыклад інтэграцыі інтарэсаў горада і еўрапейскіх экалагічных праектаў. У развіццё горада будзе ўкладзена дзевяць мільёнаў еўра, а яшчэ гэта дадатковыя рабочыя месцы, таму што большая частка работы будзе выконвацца брэсцкімі будаўнікамі. У выніку горад пазбавіцца ад застарэлай праблемы непрыемнага паху і кардынальным чынам палепшыцца якасць сцёкаў, значыць, чысцейшым стане навакольнае асяроддзе.

Рэканструкцыя пройдзе ў чатыры этапы, яе завяршэнне плануецца ў 2019 годзе. Праект уключаны ў план асноўных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да святкавання 1000-годдзя Брэста.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zbiazda.by*

# НЯПРОСТАЯ АРЫФМЕТЫКА АПК

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Цяпер адзін з кірункаў работы «Рассвета» — вырошчванне гароднін у цяпліцах. На камбінаце працуе каля 160 супрацоўнікаў, пераважна жанчыны. Шмат хто ездзе туды з Кіраўска, але гэта не лёгкія грошы: калі сонечна, тэмпература ў цяпліцах становіцца больш за 30 градусаў. Узровень заробку ў супрацоўнікаў каля 700 рублёў.

Дырэктар «Рассвета» Аляксандр Багель гаворыць, што рэнтабельнасць тут невялікая — да 5%. Нягледзячы на льготы, газ застаецца асноўным пунктам у расходах і займае каля 42%. Збіраюць каля 42 кг прадукцыі з квадратнага метра — гэта неблагі паказчык. Для барацьбы са шкоднікамі выкарыстоўваць экалагічныя спосабы: без хіміі. Але шмат чаго прыходзіцца закупляць за мяжой: угнаенні, насенне... Мінеральная вата ёсць і беларуская, але якасць у яе не тая — лепш выкарыстоўваць расійскую ці польскую. Сёлета чамусьці і чмялі ждановіцкія падвялі: не захацелі працаваць, прыйшлося іх вярнуць і закупіць у Ізраілі. У той жа час прадпрыемства толькі да 20% прадукцыі прадае на ўнутраны рынак, астатняя ідзе на экспарт, у асноўным, у Расію. Прадукт скорапсавальны, таму прадаецца оптам камерцыйным структурам.



Цяплічная гаспадарка «Рассвета».

## ЧАС ТЭХНАЛОГІЙ

Цікава, што «Рассвет» мае самую магутную біягазавую ўстаноўку ва Усходняй Еўропе. Будавацьь яе дапамагалі партнёры з Германіі, абсталяванне закуплялі таксама еўрапейскае. На ёй бактэрыі кругласутачна перапрацоўваюць гной буйной рагатай жывёлы разам з сіласам. 90—95% энергіі прадаюць у агульную рэспубліканскую сетку, цяпло ідзе на абаграванне цяпліц. Калі былі праблемныя гады — не было сіласу — працавалі толькі напалову. Зараз — на 78% ад праектнай магутнасці. Арганіка пасля выкарыстання трапляе на палі і градкі. Рэнтабельнасць складае да 80%. Працуюць тут 12 чалавек.

Побач пачалі будаваць ферму буйной рагатай жывёлы. Па плане там павінны знаходзіцца 768 дойных кароў, выпуск малака плануецца — 8500 тон у год. Да таго ж, адходы жывёлы выкарыстаюць як сыравіну і для біягазавай устаноўкі.

Адна з праблем у аграпрамысловым комплексе — перарасход корму, часам нават на 50%. Гэта характэрна ў цэлым для краіны. Сакрэт эфектыўнай эканоміі ў гэтым кірунку — спецыялізацыя. Для малочнай жывёлагадоўлі трэба вырошчваць адны расліны, для свіней — іншыя: неабходна падладжваць структуру пасяўных плошчаў. Добры корм азначае высокую якасць мяса-малочнай прадукцыі. Зацікаўленасць у такім падыходзе памяняе абстаноўку ў раслінаводстве і жывёлагадоўлі.



У санаторыі не толькі лечацца, але і павышаюць сваю кваліфікацыю.

## ВУЧЫМСЯ І ЛЕЧЫМСЯ

Не сакрэт, што кадры забяспечваюць развіццё галіны. У Магілёўскай вобласці гэтаму пытанню ўдзяляецца вялікая ўвага. Узровень забяспечанасці сельскагаспадарчымі кіруючымі кадрамі сёння складае 95%, галоўнымі спецыялістамі — 92% (з іх вышэйшую адукацыю маюць 68%), сярэдняга звяна — 96%, масавых прафесій — 98%.

Кіраванне — гэта, перш за ўсё, работа з людзьмі. Цяпер і ў галіне АПК многія не задаволены тым, што маладыя спецыялісты не да канца падрыхтаваны да працы ў рэальным сектары эканомікі. Іх прыходзіцца навучаць, але пасля адпрацоўкі па размеркаванні каля 42% сыходзіць, з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй сыходзіць амаль палова. Шмат хто ідзе на тэрміновую службу. Пры гэтым конкурс на некаторыя аграрныя спецыяльнасці зусім невялікі — бяруць амаль усіх.

У той жа час тэхналогіі пастаянна абнаўляюцца, таму неабходна рэгулярна павышаць кваліфікацыю. З гэтай нагоды ў санаторыі імя К.П. Арлоўскага ў Кіраўску і санаторыі імя У.І. Леніна ў Бабруйску разам з аздараўленнем арганізуюць курсы. За апошнія два гады там павысілі свой узровень майстэрства больш за 730 чалавек.

Санаторый «Рассвета» мае першую катэгорыю. Першапачаткова Арлоўскі будаваў на гэтым месцы прафілакторый для адпачынку калгаснікаў. Цяпер там ёсць спа-працэдуры, гідрамасаж, гразелячэбніца, мінеральная свідравіна і многае іншае. Адпачываць з уласныя грошы для беларускіх супрацоўнікаў аплаціць пуцёўкі дапамагаюць прафсаюзы і наймальнікі.

Спецыялісты, якія адпачываюць у санаторыі, таксама падзяліліся сваім меркаваннем накont праблем аграпрамысловага комплексу. Разам з больш буйнымі СПК існуюць меншыя, якім сёння даволі цяжка, перш за ўсё эканамічна. Тэхніка дарагая, канкурэнцыя высокая: Расія, як ні дзіўна, траціць на ўгнаенні не нашмат больш, чым Беларусь. Чаму? У іх шмат чарназёму, таму і зерне выходзіць таннейшае, а беларускаму вытворцу прыходзіцца неяк выкручвацца. Гэта адбіваецца і на заробку: часам ён у сельскай гаспадарцы не перавышае 200 рублёў. Такое становішча неабходна капітальна мяняць.

## ПРА ЎСЁ АДРАЗУ

Падчас абмеркавання на пасяджэнні ўзнімаліся і іншыя пытанні. Напрыклад, сёння шчыльнасць пагалоўя малая для эканамічнай мэтазгоднасці: 19 кароў і 57 адзінак буйной рагатай жывёлы на 100 га сельгасугоддзяў. Калі паглядзець на перадавыя гаспадаркі, узровень павінен быць за 25 кароў і 100 адзінак буйной рагатай жывёлы на 100 га. Усе пытанні падчас выязнога пасяджэння падрабязна абмяркоўвалі, каб мець магчымасць унесці пэўныя прапановы на нарадзе па аграпрамысловым комплексе на ўзроўні кіраўніка дзяржавы, якую плануецца правесці ў найбліжэйшы час.

Адзін з надзённых вынікаў — неабходна матываваць як кіраўнікоў, так і супрацоўнікаў. Як адзначыў Аляксандр Папкоў, самая галоўная задача — навучыцца зарабляць грошы. Для гэтага неабходна сістэма, якая выведзе прадпрыемствы на самаакупнасць. Многае залежыць ад кіраўніка, ад таго, якія мэты ён для сябе ставіць. Магчыма, гэта адна з галоўных прычын, чаму адно прадпрыемства расце, а іншае ледзь зводзіць канцы з канцамі. Больш было б у нас такіх Кірылаў Арлоўскіх, якія вярталіся б на сваю малую радзіму, каб ёй дапамагчы...

**Надзея АНІСОВІЧ.**
*anisovich@zviazda.by*



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Так выглядае санаторый ААТ «Рассвет».

## МЕРКАВАННІ

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандр ПАПКОЎ:**

— У Савеце Рэспублікі апошнія гады пачалі прымяняць практыку выязных пасяджэнняў пастаянных камісій. Па-першае, мы ставім перад сабой мэту паглядзець, як працуюць тыя ці іншыя законы, наколькі яны сёння эфектыўныя і дапамагаюць нашым вяскоўцам вырашаць задачы, якія перад імі стаяць. Маніторынг існуючай нарматыўнай базы — гэта галоўнае. Калі нешта не зусім спрацоўвае, неабходна ўнесці адпаведныя карэктывы ў існуючае заканадаўства. Але, натуральна, мы сёння павінны думаць перш за ўсё аб эфектыўнасці нашай вытворчасці. Чамусьці склалася такая практыка, што мы яшчэ з часоў Савецкага Саюза займаліся валавой вытворчасцю. Сёння мы павінны даваць такую прадукцыю, якая будзе канкурэнтаздольная на рынку, запатрабаваная, і, самае галоўнае, яна павінна прыносіць адпаведныя дывідэнды вытворцу. Таму мы ў корані вырашылі пераглядзець нашы адносіны і высветліць, дзе ж рэзервы па зніжэнні тых выдаткаў, якія сёння павышаюць кошт прадукцыі. У гэтым плане пастаўлена задача кіраўніком нашай дзяржавы паменшыць выдаткі прыкладна на 25%.

Самае галоўнае — мы павінны адысці ад імпарту. Практычна ў кожным кілаграме нашай прадукцыі да 30% замежных складнікаў. Мы закупляем бялковую сыравіну, угнаенні, сродкі абароны раслін і многае іншае. На мой погляд, у нас ёсць сёння тэхналагічныя магчымасці для таго, каб гэта вырабляць непасрэдна ў краіне і тым самым зніжаць выдаткі. Мы павінны нейкім чынам фарміраваць менталітэт нашых кадраў, каб яны пераходзілі на эканамічнае мысленне. Любое вызначальнае рашэнне, якое прымаецца кіраўніком ці проста спецыялістам, павінна зыходзіць перш за ўсё з эканомікі. Гэта самая галоўная мэта. Неабходна думаць, якім чынам кожны суб'ект гаспадарання перавесці на самаакупнасць і самафінансаванне. Каб кожны рубель, які ўкладвае дзяржава, прыносіў добрыя дывідэнды.

Сёння і «Рассвет», і агракамбінат «Сноў», і многія іншыя гаспадаркі працуюць у аднолькавых умовах. ААТ «Рассвет імя К.П. Арлоўскага» — гэта гаспадарка, якая захавала кадры, якая мае адпаведную матэрыяльную базу і з'яўляецца інтэгратарам усяго новага, таму, укладваючы туды дзяржаўныя субсідыі, мы заўсёды будзем атрымліваць больш хуткую аддачу. Мы павінны думаць, якім чынам развіваць гэтыя кропкі росту, каб яны былі маякамі ў нашым аграпрамысловым комплексе.

**Намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Ала ЛАМАКІНА:**

— Эканамічнай устойлівасці ў аграрным сектары ў нас няма. Па ўзроўні эфектыўнасці беларускі АПК адстае ад АПК вядучых еўрапейскіх краін. Па звестках Сусветнага банка, валавая дабаўленая вартасць сельскай гаспадаркі ў разліку на аднаго работніка ў сярэднім па краінах Еўрапейскага саюза складае каля $28 000, у Германіі — $33 000, Аўстрыі — $44 000, у Беларусі — толькі $16 000. Дэфіцыт фінансавых сродкаў, які звязаны з гэтым фактарам, практычна паралізуе выкананне ўсіх праграм, якія намечаны сёння ў аграрным сектары. Фарміруюцца завышаныя для Беларусі патрабаванні да бюджэту краіны.

Канкурэнтаздольнасць нашай прадукцыі сёння не дазваляе свабодна прысутнічаць на тых рынках, якія мы, у прынцыпе, для сябе адкрываем. У гэтых умовах вельмі важна сарыентавацца на максімальную рэалізацыю тых рэзерваў, якія ўжо ёсць у галіне. Калі мы паглядзім дынаміку нашай сельгасвытворчасці, то ўбачым, што з тым узроўнем дзяржаўнай падтрымкі, які сёння аказаны, у нас каля 30% арганізацый краіны не ў стане акумуляваць прыбытак: яны працуюць стратна. Асноўная роля рэгіянальных органаў улады ў тым, каб пераламаць сітуацыю на рэалізацыю пазітыўнага росту.

Асноўныя фінансавыя сродкі сканцэнтраваны ў малочна-мясной жывёлагадоўлі — гэта прыярытэт беларускага аграрнага сектара. Прадукцыя, па-першае, запатрабаваная і ёсць перспектыва яе рэалізацыі на знешніх рынках. Па-другое, кожнае сельгаспрадпрыемства сёння мае такую прадукцыю, і гэта з'яўляецца стабільнай крыніцай паступлення сродкаў у гаспадарку. 1638 малочнатаварных ферм мадэрнізаваныя. Толькі з 2010 года 432 пабудаваныя, 966 рэканструяваныя. На 44% гэтых ферм мы маем прадукцыйнасць ніжэй за сярэднерэспубліканскі ўзровень. У нас сёння 21 500 незапоўненых жывёламесцаў, 322 аб'екты ў жывёлагадоўчай сферы, дзе не скончана будаўніцтва па прычыне недахопу сродкаў.

Праблемы ляжаць і ў галіне кормавытворчасці. Сярэдняя тэмпература «па шпіталі» нармальная, але мы практычна не маем той структуры кармавых угоддзяў, якая адпавядае патрэбам жывёлагадоўлі: у нас пераkosы ў вытворчасці кукурузы, шматгадовых траў, не працуем з зернебабовымі культурамі. Ёсць 372 000 тон зернебабовых культур, а трэба — мільён тон. Гэта не дазваляе сфарміраваць неабходную структуру кормавытворчасці, не дазваляе рэалізаваць той патэнцыял, які сёння маем.

Патрэбен механізм, каб гэтую сітуацыю пераламаць.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

МЕРКАВАННІ

# «ЯКІЯ БОЛЕВЫЯ КРОПКІ СЁННЯ ЁСЦЬ У БЕЛАРУСКІМ АГРАПРАМЫСЛОВЫМ КОМПЛЕКСЕ?»

Такое пытанне мы адрасавалі тым, хто мае непасрэднае дачыненне да сельскай гаспадаркі.

**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па аграрнай палітыцы Яўген АДАМЕНКА:**

— Як і ў любым комплексе, няхай гэта будзе прамысловы або будаўнічы, тут ёсць шмат болевых кропак. Больш за тое, на кожным сельгаспрадпрыемстве — свае праблемы. Сёння і Прэзідэнт, і Савет Міністраў шмат робяць для таго, каб адбывалася фінансавае аздараўленне сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. Акрамя таго, многія гаспадаркі працуюць паспяхова і арганізавана. Важна, каб умовы надвор'я не падвялі. А то кожны год адбываюцца нейкія катаклізмы — напрыклад, у Гомельскай вобласці ўжо два гады запар засуха. Гэты год таксама няпросты: ужо лета, а яшчэ холадна. Спадзяюся, што ўсё будзе ў парадку, кармы вырастуць. Я шмат гадоў прапрацаваў у гэтай сферы, таму ведаю, наколькі важныя ўмовы надвор'я. Гэта галоўнае, а вяскоўцы зробяць усё, каб быў дастойны ўраджай.

**Першы намеснік старшыні Шаркаўшчынскага раённага выканаўчага камітэта, начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Сяргей СТРУЙ:**

— Эканамічная сітуацыя складаная — гэта раз. Зараз ідзе корманарыхтоўка, і нешта наша сучасная тэхніка нас трохі падводзіць — гэта два. Акрамя таго — гэта ўжо больш да нашага раёна адносіцца — слабы травастой сёлета. Але мне здаецца, што не толькі ў нас такая праблема. Як перадолець усё гэта? Вядома, многае залежыць ад надвор'я. Што ж датычыцца тэхнікі, то тут усё вырашае фінансавы бок пытання. Не ведаю, з чым гэта звязана, але перыядычна здараюцца розныя паломкі. А кармы трэба ўбіраць. Тэрміны ж ужо падышлі. На мой погляд, у кожнай гаспадарцы сёння ёсць свае праблемы.

**Старшыня сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва «Путрышкі» Гродзенскага раёна Віктар ПЕТРУШКЕВІЧ:**

— Я б вылучыў дзве болевыя кропкі: па-першае, гэта дыспарытэт цэн, па-другое, гэта адсутнасць прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці. Што азначае першы аспект? Гэта розніца паміж коштам прадукцыі, якую вырабляюць сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, і коштам хімікатаў, медыцынскіх прэпаратаў, запчастак для тэхнікі і ўсяго астатняга. За мяжой ёсць такая схема: за адзін літр малака можна купіць два літры саляркі. Падкрэсліваю, менавіта для сельскагаспадарчых вытворцаў. У нас жа за адзін літр малака можна купіць, скажам, палову літра такога паліва. Гэта значыць, розніца выходзіць прыблізна ў 4 разы. Што да другога моманту, то я лічу, што на зямлі павінен быць не арандатар, а гаспадар, каб ён меў права распараджацца сваёй зямлёй. Я маю на ўвазе не арэнду ў дзяржавы, а менавіта прыватнае валоданне. Што датычыцца пераадолення гэтых момантаў, то пра гэта гаварыць вельмі складана. Я працую з канкрэтнымі ўмовамі і пэўнай сітуацыяй.

**Старшыня Слабада-Кучынскага сельскага Савета Капыльскага раёна Нэлі ГУСЕВА:**

— Я назаву дзве праблемы: недахоп фінансавання і дыспарытэт цэн. Мабыць, гэта асноўныя пытанні ў гэтай сферы. На першым моманце ўсё зразумела, а што да другога, то сёння цэны, дапусцім, на гаручае растуць хутка, а на сельскагаспадарчую прадукцыю растуць павольна. Я б сказала, што ў сельскай гаспадарцы стан канкрэтнага прадпрыемства залежыць ад многіх аспектаў — пачынаючы ад умоў надвор'я і заканчваючы суб'ектыўнымі фактарамі — стаўленнем людзей і іншымі. У нашым раёне працуе дастаткова моцнае сельскагаспадарчае прадпрыемства, яно актыўна развіваецца. Ці ёсць у яго праблемы? Ведаеце, жыццёвых праблем хапае, але ўвогуле адбываецца паступовае развіццё.

**Намеснік дырэктара камунальнага ўнітарнага сельскагаспадарчага прадпрыемства «Варанецкі» Бераставіцкага раёна Мар'ян ДАБРУК:**

— На мой погляд, усё залежыць ад канкрэтнага прадпрыемства. Так атрымліваецца, што сёння ёсць моцныя гаспадаркі, а ёсць больш слабыя. Акрамя таго, істотна адрозніваюцца самастойныя арганізацыі і тыя, каму розныя спосабы дапамагаюць. Мне здаецца, сёння ўсялякіх праблем можна пазбегнуць, калі шчыльна працаваць з кіраўніцтвам раёна, а таксама непасрэдна з людзьмі. Трэба набіраць новыя кадры, паколькі сёння не кожны зможа адаптавацца пад новую тэхніку. Гэта значыць, патрэбны высокакваліфікаваныя спецыялісты. Тое ж самае датычыцца і ветэрынарных лекараў, і інжынераў, і іншых катэгорый. Што тармозіць развіццё гаспадарак? Бываюць розныя абставіны. Я лічу, што ядром любога прадпрыемства з'яўляюцца людзі. Калі ёсць згуртаваны калектыў, ёсць зацікаўленасць у працы, то ўсё будзе атрымлівацца.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

СВАЯ ЗЯМЛЯ

# ГАСПАДАР АДКАЗВАЕ ЗА ЎСЁ

**Не ўсе сельскагаспадарчыя кааператывы развіваюцца аднолькава: многія перажываюць далёка не лепшыя часы. Падчас выязнога пасяджэння прадстаўнікі прыбытковых гаспадарак расказалі, як яны выраслі да такога ўзроўню, а навукоўцы растлумачылі, чаму не ўсе змаглі да яго дацягнуцца.**



**Сялянская фермерская гаспадарка «Дзіяна» Шклоўскага раёна** ўтварылася ў 1991 годзе. «Мы былі фермерамі першай хвалі на плошчы 50 га, — расказвае яе **кіраўнік Уладзімір МАЛІНОЎСКІ.** — За гэты час мы не прыватызавалі і не купілі ніводнага аб'екта, а ўсё, што пабудавана, было зроблена ўласнымі сіламі. Зараз мы апрацоўваем 1351 га ворнай зямлі. Гэта складае 2% ад ворных зямель нашага раёна. І на іх мы вырабляем 4% таварнай прадукцыі раёна, пры тым што ў нас яшчэ няма жывёлагадоўлі. Але планы па будаўніцтве малочнатаварнай фермы выношваем». Гаспадарка супрацоўнічае з шэрагам замежных кампаній. Гэта дало магчымасць стварыць сучасную вытворчасць па захоўванні і перадпрадажнай падрыхтоўцы бульбы на 30 000 тон, насення збожжавых на 8000 тон.

Добрыя паказчыкі ў агракамбіната «Сноў»: ён вырабляе 29 000 тон малака, 27 000 тон мяса. «Усё гэта мы перапрацоўваем на малочным заводзе і мясакамбінаце, — тлумачыць **старшыня сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва «Агракамбінат Сноў», намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Мікалай РАДАМАН.** — Сёння, можа, нават выгадней прадаць сыравіну па добрых цэнах, чым вырабляць вузкі кірунак прадукцыі, якая не дае пэўнага прыбытку. У гаспадарцы працуе 1900 чалавек. Сярэдні заробак за мінулы год — 790 рублёў. Для сельскай мясцовасці ён больш-менш годны. Мы выпускаем каля 20 відаў малочнай прадукцыі і каля 300 — мясной. 35% прадукцыі адпраўляецца на экспарт, 25% прадаецца праз фірменную гандлёвую сетку. Астатняе — гандлёвым арганізацыям. Асноўны аб'ём экспарту, вядома, ідзе ў Расійскую Федэрацыю. На жаль, мы трапілі пад пэўныя санкцыі: з 4 лютага па 24 мая Мінская вобласць была закрытая для Расіі. Пераадолелі мы цяжкасці, што паўсталі з пастаўкай сутачных курanят, калі ў заходніх краінах быў птушыны грып. Часткова не працавалі два месяцы па вытворчасці птушкі, але да канца года выйдзем на запланаваныя паказчыкі».

Кіраўнікі сельскагаспадарчых арганізацый сыходзяцца на тым, што не ўсё ідзе гладка. Часам непаразуменні сустракаюцца і ў дыялогах з кіраўнікамі райвыканкамаў. Да таго ж было б добра прадумаць пытанне фінансавання праз банкі пад ільготныя працэнты буйных гульцоў на рынку малака і мяса. На думку **дырэктара рэспубліканскага навуковага ўнітарнага прадпрыемства «Інстытут сістэмных даследаванняў у АПК» Аляксандра ШПАКА,** «на ўзроўні з рэспубліканскімі, рэгіянальнымі, кіруючымі структурамі АПК важная роля ўскладаецца на мясцовыя органы ўлады. Яны перш за ўсё адказныя за стан спраў у рэгіёнах. Эканамічны механізм у нас з 1990 года не адпавядаў рыначнай сістэме гаспадарання. І мы сельскую гаспадарку праз гэты эканамічны механізм увесь час ушчамлялі, ёй заўсёды адкрываліся меншыя прыбыткі, і заўсёды яна была абдзеленая. Вы глядзіце, якая сітуацыя сёння: у сельскай гаспадарцы банкруты, сусветны крызіс уплывае аднолькава на ўсю эканоміку. Нізкія цэны і высокія крэдытныя стаўкі заганялі нашы суб'екты гаспадарання ў даўгавую яму. Гэта быў працяглы працэс і выйсці з яго хутка не атрымаецца. Неабходна забяспечыць парытэтныя адносіны сельскай гаспадаркі з партнёрамі: машынабудаўнікамі, перапрацоўчымі арганізацыямі, гандлёвымі сеткамі і банкамі».

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

КАСАВІЦА

# Як падсілкуешся, так і папрацуеш

**У адкрытым акцыянерным таварыстве «Рачэнь» Любанскага раёна блізіўся да завяршэння першы ўкос траў. На поле я падаспела якраз апоўдні. І трапіла на абед.**

— Ці добра кормяць вас сёлета? — пацікавілася ва ўдзельнікаў корманарыхтоўкі.

— Не скардзімся, — пачулася дружнае ў адказ. — Сёння на першае суп, на другое— панцак з мясам, гарбата з коржыкам.

Вадзіцель Мікалай Крывальцэвіч ужо трынаццаць гадоў на пенсіі, але працягвае працаваць і не ўступае на адвозцы «зялёнай масы» маладым.

— На свае гады, Мікалай Мікалаевіч, вы нядрэнна выглядаеце, — звяртаюся да яго.

— Дык жонка добра даглядае, — жартуе ён, — ды і на рабоце, як бачыце, смачна кормяць.

— Стараемся разнастаіць меню, — кажа раздатчыца абедаў Тамара Запольскіх. — Прывозім розныя кашы — з катлетай, гуляшом, курацінай, свінінай, ялавічынай, баршчы, супы. На дэсерт — чай, кава або кампот са здобай, коржыкам, піроЖным. Бывае, хлопцы замаўляюць стравы па сваім гусце. Заказы абавязкова выконваем.

Тамара Уладзіміраўна дастаўляе абеды для механізатараў ужо не першы год. Пасада ў яе адказная: своечасова прывезці стравы на поле. Работа ў жанчыны пачынаецца з самай раніцы: неабходна размеркаваць прыгатаванае ў асобныя кантэйнеры, загрузіць іх у спецыяльна абсталява-



ны аўтобус, не забыць чысты ручнік, сурвэткі, мыла.

— Кормім людзей два разы ў дзень, вылічваем з іх заробку толькі 25% кошту. У залежнасці ад меню атрымліваецца 70—80 капеек, — уступае ў размову **дырэктар ААТ «Рачэнь» Максім МАЦЯС.** — У нас няма сваёй сталовай, але на тэрыторыі гаспадаркі знаходзіцца сталовая сістэмы грамадскага харчавання раёна. Тут і замаўляем абеды. У пачатку сезона карэкціруем іх пад сваіх людзей: бяром двайную порцыю. Бо як яны паядуць, так і папрацуюць.

Усяго ж на корманарыхтоўцы занята каля 40 чалавек. З траў першага ўкосу планоўца нарыхтаваць каля 10 тыс. тон сенажу. І на гэтым у акцыянерным таварыстве спыняцца не збіраюцца: пачынаецца другі этап касавіцы. У планах — назапасіць 20 тыс. тон сенажу і 30 тыс. тон сіласу.

— Калі я прыйшоў паўтара года таму ў сакавіку ў «Рачэнь», тут заставалася кармоў на два дні, — успамінае кіраўнік. — За тры з паловай месяцы закупіў 3 тыс. тон кармоў. Натуральна, грошай на ўсё не хапала і даводзіся разлічвацца жывёлай.

Сёлета на «зялёны ўраджай» не лепшым чынам паўплывала нестабільнае веснавое надвор'е. Днём — холад, ноччу — замаразкі.

— У выніку мы не дабіраем прыкладна 30% ад ураджайнасці траў, — прызнаўся Максім Мацяс. — Але нягледзячы на сюрпрызы надвор'я, касавіцу пачалі 22 мая, калі травы дасягнулі аптымальнай фазы для ўборкі, калі ў іх назапасілася неабходная колькасць бялку, пратэіну.

Кармавая база дазволіць без праблем перазімаваць жывёле. Тым больш што ў гаспадарцы яшчэ з мінулага года засталося 10 тыс. тон кармоў. Малады кіраўнік надае ім першаступеннае значэнне. Ён лічыць, што кармы — гэта ўсё: і прыбаўленні ў вазе, і надоі, і зарплата працаўнікоў, а значыць, будучае гаспадаркі.

У «Рачэні» 8 тыс. 650 галоў буйной рагатай жывёлы, 1800 дойных кароў, 4200 быкоў на адкорме. «На сённяшні дзень доім 15,5 літра малака ад каровы штодзень. Гэта невялікі вынік, але нам ёсць куды расці, куды імкнуцца», — упэўнены дырэктар.

Сярэдняя зарплата ў таварыстве за год вырасла на 120 рублёў. У сезон корманарыхтоўкі механізатары зарабляюць чыстымі ад 800 да 1200 рублёў. На асобных работах — да 1500 —1800 рублёў. За перавыкананне нормы ўдзельнікам корманарыхтоўкі даплачваюць у залежнасці ад колькасці нарыхтаваных або перавезеных тон «зялёнай масы».

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

# НА ПАЛЕТКІ ПРЫЙДУЦЬ... КАМП'ЮТАРЫ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1–й стар.)***

Плады збіраюцца без пашкоджанняў, што вельмі важна для іх захавання. Машына абсталявана секатарамі, таму яе можна выкарыстоўваць на абрэзцы дрэў. Што датычыцца прычапных камбайнаў, то яны таксама скіраваны на акуратную работу з ураджаем. Так, морква збіраецца захватам за бацвінне і выштурхоўваннем з зямлі. Пасля гэтага «хвосцік» не пераразаецца, а адмінаецца, што добра ўплывае на тэрміны захавання прадукцыі.

***— Хто з'яўляецца асноўным спажыўцом вашай тэхнікі: беларускія ці замежныя гаспадаркі?***

— У нашай структуры знаходзіцца даччынае дзяржаўнае прадпрыемства «Эксперыментальны завод», а таксама доследная вытворчасць НПЦ у Ждановічах, дзе размяшчаецца выпрабавальны палігон і доследнае поле. Дык вось, калі на першым прадпрыемстве прыкладна 90 працэнтаў прадукцыі ідзе на экспарт, то на другім сітуацыя супрацьлеглая — пераважная частка паступае на ўнутраны рынак. Гэта і дзяржаўныя гаспадаркі, і прыватныя фермерскія. Але агульны аналіз сітуацыі паказвае, што цяпер паўсюдна ідзе спад аб'ёмаў закупкі сельскагаспадарчай тэхнікі. Звязана гэта з тым, што паступова спісваюцца старыя нізкапрадукцыйныя машыны, а магчымасці новых (высокая надзейнасць і функцыянальнасць) дазваляюць




Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Распрацаваная ў НПЦ бульбяная саджалка забяспечвае поўны комплекс догляду культуры: пасадку, угнаенне, пратручванне клубняў. 90 працэнтаў камплектуючых — беларускія.**

не набываць іх у такой вялікай колькасці для захавання раней-шых аб'ёмаў работы.

***— Наколькі айчынны АПК сёння забяспечаны сучаснымі машынамі?***

— Існуе невялікая праблема з набыццём гаспадаркамі менавіта нашай інавацыйнай тэхнікі, бо яна каштуе немалых грошай (хоць і таннейшая за замежныя аналагі ў сярэднім на 30—50%). Але цяпер многія з іх выходзяць на высокія аб'ёмы вытворчасці, расце ўраджайнасць культур, высокія паказчыкі дэманструе жывёлагадоўля, таму мы разлічваем, што ўжо ў хуткім часе прадпрыемствы сферы АПК змогуць актывізавацца ў гэтым кірунку. І кіраўніцтва краіны, і Мінсельгасхарч займаюцца згаданым пытаннем, таму вялікіх хваляванняў у нас гэта не выклікае.

***— Ці ёсць складанасці з укараненнем новых распрацовак у саміх гаспадарках?***

— Так, безумоўна, бо многія з іх прывыклі працаваць са старымі машынамі — надзейнымі і простымі. Гэту тэхніку добра ведаюць механізатары, няма праблем з сэрвісам. А мы вядзём распрацоўку новых узораў, якія абсталяваны камп'ютарамі, што патрабуе адпаведнай кваліфікацыі ад людзей. Ужо працуем над вырашэннем гэтага пытання, у прыватнасці, праводзім на базе цэнтра навучанне механізатараў, ладзім «дні адчыненых дзвярэй» для навучэнцаў аграрных навучальных устаноў, публікуем даведачныя матэрыялы па новай тэхніцы на сваім сайце. У межах выстаўкі «Белагра», напрыклад, правялі тры семінары, якія ахапілі ўсе кірункі нашых распрацовак.

***— А з замежнымі навукоўцамі-аграрыямі супрацоўнічаеце?***

— Якраз нядаўна завяршылася саюзная праграма «Інавацыйнае развіццё вытворчасці бульбы і тапінамбуру», рэалізацыя якой праходзіла сумесна з Расійскай Федэрацыяй. Мы распрацавалі шэраг машын для поўнага цыклу вытворчасці: пасадкі гэтых культур і догляду за імі, уборкі, апрацоўкі і ўпакоўкі. Справа ў тым, што бульба і тапінамбур маюць падобныя тэхналогіі вырошвання, таму і было прынята рашэнне аб стварэнні такой машыны. З боку Беларусі ўдзел у рабоце, акрамя нас, прымалі такія навуковыя арганізацыі, як НПЦ НАН па бульбаводстве і плодаагародніцтве, НПЦ НАН па харчаванні, Цэнтральны батанічны сад. Яны змаглі распрацаваць тэхналогіі вырошвання і перапрацоўкі, а таксама вывесці сарты тапінамбуру, які па форме наблізіліся да бульбяных клубняў. Адзінае, што гэта культура вельмі лёгка псуецца — дастаткова нават дробнай драпіны, каб адбылося загніванне. Таму мы таксама ўдзялілі вялікую ўвагу беражліваму збору ўраджаю. Гэта тэхніка ўжо выстаўлялася на «Белагра», цяпер вядзём збор заявак ад гаспадарак.

***— Якія кірункі развіцця аграрнапрамысловай тэхнікі спецыялісты НПЦ лічаць самымі перспектыўнымі?***

— Безумоўна, мы сочым за апошнімі сусветнымі трэндамі ў гэтай сферы. Не сакрэт, што цяпер павялічваецца магутнасць тых жа трактароў, для іх патрэбны адпаведныя агрэгаты з больш высокай прадукцыйнасцю. Але гэта не значыць, што мы можам, умоўна кажучы, зрабіць для вялікага трактара гіганцкі плуг — ёсць пэўная мяжа, пераходзіць за якую нельга. Бо мы або будзем парушаць структуру глебы, або пераўшчыльняць яе. Таму спрабуем знайсці «залатую сярэдзіну», асабліва звяртаем увагу на рабатызацыю сельгастэхнікі.

Ужо распрацавалі шэраг поўных комплексаў абсталявання для жывёлагадоўлі: у тым ліку стойлавае, прылады для кармлення і праграмнае забеспячэнне для іх. Камп'ютар дазваляе практычна выключыць удзел чалавека з работы комплексу. Ужо шэсць такіх распрацовак мы ўкаранілі ў розных рэгіёнах Беларусі. Акрамя гэтага, у нас створана асобная лабараторыя, якая займаецца стварэннем бартавых камп'ютараў, якія поўнасцю адсочваюць работу ўсіх тых машын, пра якія я гаварыў у пачатку размовы. Мы актыўна мадэрнізуем тэхніку, дапрацоўваем існуючыя мадэлі, таму бачым у гэтым перспектыву.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

ПЫТАЛЬНІК

# ДЗЕ НАБЫЦЬ МІЦЭЛІЙ ВЕШАНАК?

## або З уласнага досведу іх вырошчвання

***У свой час калгас «Новы шлях», што ў Баранавіцкім раёне, даволі актыўна займаўся вырошчваннем вешанак: спачатку ў падвальным памяшканні адміністрацыйнага будынка, потым — у неабсталяваным бульбасховішчы. Цяпер той гаспадаркі няма, а ёсць іншае сельгаспрадпрыемства. Якім жа было маё здзіўленне, калі нядаўна даведаўся, што ранейшы калгас не толькі бульбу не вырошчвае, але і грыбы. А менавіта ў гэтай гаспадарцы нашы жыхары набывалі міцэлій вешанкі, заводзілі на прысядзібных участках цэлыя грыбныя плантацыі. Не выключэннем была і наша бацькоўская сядзіба. А цяпер вяскоўцы не ведаюць, дзе, як і калі набыць міцэлій.***

***Васіль ПАНАСЮК,***
*вёска Галоўчыцы Драгічынскага раёна.*

А ніякага пытання ў прынцыпе няма. Патрэбны вяскоўцам міцэлій вешанкі прадаецца, напрыклад, у сталіцы на рынках, а таксама ў шматлікіх крамах і аддзелах, якія гандлююць насеннем агародніны, адпаведных спецыялізаваных секцыях гіпермаркетаў. Прычым тут жа можна набыць міцэлій не толькі гэтых грыбоў, але і апенек, чырвонагаловікаў, белых. Думаецца, такая ж сітуацыя і ў іншых гарадах, не толькі ў вялікіх. Калі дзе ў продажы міцэлію няма, яго можна паспрабаваць папярэдне заказаць у прадаўца насення. Хапае прапаноў ад індывідуальных прадпрымальнікаў і ў інтэрнэце, спецыяльна праверыў. Розныя сарты, цэны прыкладна аднолькавыя — 4—4,5 рубля за пачкілаграма, магчыма адпраўка поштай. Толькі ў многіх крамах. Зайшоў у адзін з буйных гіпермаркетаў і не змог знайсці міцэлій, хоць дакладна памятаў, дзе ён звычайна ляжыць. Давялося прасіць дапамогі ў прадаўца. Тая адразу адказала, што ў іх застаўся толькі адзін пакет — з міцэліем белых грыбоў (яго можна выкарыстоўваць з мая па верасень на ўчастках, дзе растуць хваёвыя дрэвы; шчыра кажучы, не чуў, каб нехта такім чынам вырошчваў лясныя грыбы). Справа ў тым, што попыт на такі тавар з боку большасці пакупнікоў (калі чалавек не займаецца вырошчваннем грыбоў у якасці бізнесу) носіць сезонны характар, а «сезон» прыпадае дзесьці на пачатак — канец сакавіка. Паспрабую растлумачыць чаму.

Вешанка — вельмі папулярны прадукт для вырошчвання ў дамашніх умовах. І самі грыбы смачныя і карысныя. Грыбніца развіваецца вельмі хутка, засвоіць агратэхніку не цяжка любому. Але, на мой погляд, гэты працэс у пэўнай ступені даволі працаёмкі. Ды і ўмовы патрэбны. Мая сям'я займалася вырошчваннем вешанак для сябе некалькі гадоў запар, а потым адмовілася.

Па-першае, у нас невялікі ўчастак, таму ад развядзення грыбоў на цурках адмовіліся адразу, выбралі іншы субстрат расліннага паходжання — салому. Значыць, яе трэба знайсці. Потым салому трэба здрабніць, напрыклад, сякерай на калодцы на кавалачкі па некалькі сантыметраў. Атрыманую «сечку» — абдаць кіпнем (адпаведна, аб'ём істотна змяншаецца: каб запоўніць гатовым субстратам некалькі невялікіх пакетаў, трэба насекчы як мінімум з паўтузіна вялікіх). Пасля раскласці па цэлафанавых пакетах і «зарадзіць» іх міцэліем. Праз вызначаны час у пакетах трэба будзе прарэзаць невялікія дзірачкі, адкуль і з'явяцца вешанкі.

У грыбніцы існуе некалькі этапаў развіцця, падчас якіх ёй патрэбна забяспечыць аптымальныя ўмовы для росту. Калі няма добрага прыстасаванага памяшкання, даводзіцца «пакруціцца». Перыяд інкубацыі ў грыбніцы доўжыцца 13—20 дзён, у гэты час ёй патрэбна высокая вільготнасць (яна заўсёды



Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

патрэбная), высокая тэмпература і поўная цемра. У гэты час сваё мяхі мы трымалі ў дрывотні, апырскваючы іх з пульверызатара. Далей цягам 4—7 дзён ідзе развіццё грыбніцы, калі мяхі знутры зацягвае нібы белым павуціннем. Тэмпературу трэба паніжаць, арганізаваць паўцень і праветрыванне. У гэты час мы пераносілі мяхі ў склеп з адкрытым люкам. Далей цягам 5—8 дзён адбываецца плоданашэнне, падчас якога тэмпературу зноў павышаюць і арганізоўваюць праветрыванне. Наш будучы ўраджай зноў перакачоўваў у дрывотню. Растуць вешанкі ў гэты момант вельмі хутка: увечары толькі праклюнуліся, а ранкам па баках мяхоў ужо вісяць «лапухі». Поўны цыкл ад пасадкі да збору ураджаю — 30—35 дзён. Хутка. Але самым складаным з'яўляецца забеспячэнне ўмоў. Калі тэмпература моцна павысіцца, плоданашэнне спыняецца.

Таму, калі ёсць залежнасць ад умоў надвор'я, аптымальна «зараджаць» міцэлій у сярэдзіне — канцы красавіка. Дарэчы, прыкладна ў гэты ж час большасць з нас набывае насенне агародніны, заадно можна прыкупіць і міцэлій.Тады сама «нябесная канцылярыя» дапамагае (гаворка не пра сёлетні год) пры адсутнасці прыстасаванага памяшкання забяспечваць адносна аптымальныя ўмовы для грыбніцы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

# ЯК ХУТЧЭЙ ЗНАЙСЦІ ДЭПУТАТА

**Наш карэспандэнт паназірала, як у Асіповічах народныя выбраннікі ўстанаўліваюць сувязі з жыхарамі і ўзаемадзейнічаюць з бізнесам**

**Людзі часам скардзяцца, што ад дэпутатаў мала карысці. Маўляў, да выбараў наабяцаюць горы залатыя, а калі мандат атрымаюць, пра іх нідзе не чутно. У Асіповічах знайшлі дзейсны метад, як арганізаваць найбольш эфектыўна работу народных выбраннікаў. У месцах, дзе звычайна праходзяць выбарчыя кампаніі і людзі вырашаюць, за якога дэпутата ім прагаласаваць, створаны камітэты тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. Гэта, можна лічыць, штаб-кватэра дэпутата пэўнай акругі. Тут жа размешчаны інфармацыйныя стэнды, праводзяцца прамыя лініі і сходы. Карысць ад такой работы відавочная.**

## БЫЦЬ БЛІЖЭЙ ДА ЛЮДЗЕЙ

— Усе праблемы дэпутат, канешне, не вырашыць, але трэба паклапаціцца аб умовах для іх вырашэння. І такія камітэты проста неабходныя для гэтага, — дзеліцца вопытам **старшыня Асіповіцкага райсавета дэпутатаў Аляксандр ПУЗІК.** — Дэпутат узначальвае камітэт і праводзіць работу. Стэнды, аб'явы — усё гэта дапамагае эфектыўнаму распаўсюджванню інфармацыі. Трэба, каб выбаршчыкі ведалі, дзе знайсці дэпутата, каб не казалі, што не ўяўляюць, хто ён такі і чым займаецца. У дэпутата павінны быць памочнікі. Мы абмяжоўваемся дзесяццю членамі тэрытарыяльнага самакіравання, якія жывуць у розных кропках горада.


Аляксандр Пузік: «Тут уся інфармацыя для выбаршчыкаў».

Аляксандр Пузік прапануе паглядзець, як працуе сістэма. Спачатку едзем да раённага дома культуры, дзе пад адным дахам суіснуюць два камітэты тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання — Першамайскі і Дзмітраўскі. На інфармацыйных дошках — імёны і прозвішчы старшынь і іх памочнікаў, сярод якіх пенсіянеры, ветэраны, кіраўнікі арганізацый, актывісты ад народа. Тут жа пазначаны іх пасады і тэлефоны, у тым ліку і мабільныя, каб хутчэй можна было знайсці. Каб не было блытаніны, размешчаны схемы той часткі горада, на якой працуюць камітэты. Пазначаны нават вуліцы і дамы, якія знаходзяцца пад іх наглядам. Тут жа графікі прыёму грамадзян дэпутатамі райсавета. Як усё гэта дапамагае вырашаць праблемы жыхароў?

— Адно з праблемных пытанняў сёння — вялікая колькасць машын, — прыводзіць прыклад дэпутат. — Сёння ўсе хочуць, каб машына стаяла каля пад'езда, а месцаў не хапае, асабліва ў раёнах старой забудовы. Мы прыцягваем сродкі насельніцтва і дзесьці спрабуем пашырыць аўтастаянку. Летась зрабілі чатыры такія паркоўкі на 56 месцаў. З іх дзве на 16 месцаў з'явіліся за кошт сродкаў аўтаўладальнікаў. Плануем і далей працягваць гэту работу. Задача дэпутата і члена тэрытарыяльнага самакіравання — сабраць народ і аб'явіць. Хапае, безумоўна, і прэтэнзій, але людзі павінны выпускаць пару. Калі мы прапануем зрабіць нешта за іх грошы, шмат хто спачатку адмаўляецца. Маўляў, у суседзяў зрабілі за дзяржаўны кошт, а чаму мы павінны плаціць. Прыходзіцца тлумачыць, што зараз дамы будуюцца па іншых праектах, там прадугледжваецца больш месца пад паркоўкі. Але забудоўшчыкі там таксама ўносяць грошы.

## ЖЫВЁМ, ЯК У ГЕРМАНІІ

Яшчэ адзін прыклад дзейнай работы камітэта тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання — дом па вуліцы Сташкевіча. Будынак новы, але жыхары пад кіраўніцтвам старшыні дома Юрыя Лявончыка паспелі зрабіць тэрыторыю больш прывабнай для вока і зручнай для пражывання.

— Жыхары ў нас маладыя, ініцыятыўныя. Пішам аб'явы, і яны самі падыходзяць, пытаюцца, што рабіць, — кажа старшыня дома. — У доме прапісана 429 чалавек, 54 — дзеці да 7 гадоў. Дом яшчэ на гарантыі, усё зроблена сумленна, але шмат чаго мы стварылі сваімі сіламі. Сабралі грошы на агарođжу, сістэму відэаназірання паставілі, бацькі за свой кошт абсталявалі пясочніцы, устанавілі арэлі. Жывём цяпер, як у Германіі.

— Юрый Вячаслававіч наогул ініцыятыўны чалавек, — дадае Аляксандр Пузік. — Акрамя таго, што ён старшыня жыллёва-будаўнічага кааператыва, ён яшчэ і член камітэта тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, працуе ў цесным кантакце з дэпутатам раённага савета Анжэлай Хлус. У яе на ўчастку 1200 выбаршчыкаў, а ён даводзіць да розуму свой аб'ект. Дзякуючы яго ініцыятыве зрабілі паркоўку, падзялілі яе лініямі, кожны цяпер ведае сваё месца. Ды і маёмасць пад наглядам. Купілі 16 відэакамер для пад'ездаў і ліфтаў. Гэта дысцыплінуе народ, бо парушальніка абавязкова знойдуць.

Дарэчы, было ўжо некалькі прэцэдэнтаў, калі сістэма відэаназірання дапамагла вырашыць спрэчкі мірным шляхам. Адной чы адзін аўтаўладальнік няўдала прыпаркаваўся і хацеў скрыць гэты факт. Але праглядзелі здымку, і тайнае стала відавочным. Быў таксама выпадак, калі жыхары пакінулі сумку і пайшлі. А калі спахапіліся, сумкі на месцы ўжо не было. Шукаць доўга не прыйшлося, зноў відэакамеры дапамаглі.

## КАВЯРНЯ І АЛЕЯ ДЛЯ ЗАКАХАНЫХ

Асіповіцкія дэпутаты сябруюць з бізнесам, што таксама на карысць жыхарам горада. Гандлёвы цэнтр «Рахмат», напрыклад, зроблены на месцы былой кацельнай. Ранейшы будынак не песціў сваім выглядам вока, а зараз гэта адзін з найбольш папулярных у горадзе аб'ектаў. Дзякуючы дырэктару гандлёвага прадпрыемства «Хутарок-гандаль» Мікалаю Рафаловічу, у Асіповічах з'явіўся яшчэ адзін шматфункцыянальны гандлёвы цэнтр. Фірма адкрыла краму будаўнічых матэрыялаў, зрабіла кавярню, а частку гандлёвых плошчаў выдзеліла Еўраопту. Аб'ект выглядае па-сучаснаму, створаны ўмовы для безбар'ернага асяроддзя. Бачна, што зручныя



Была кацельная, стаў гандлёвы цэнтр.


Адзін з відаў на алею для закаханых.

пандусы, парэнчы рабіліся не для справаздачы.

А каб спажывец не толькі прыйшоў, нешта набыў і пайшоў, прадпрымальнік стварыў зону для культурнага адпачынку. На тэрыторыі кавярні з'явілася алея для закаханых з танцуючымі ліхтарамі і сімпатычнымі лаўкамі з ажурнымі металічнымі ўпрыгажэннямі. Прыватнае прадпрыемства мае цэх мастацкага кавальства, дзе вырабляюцца неабходныя рэчы для будаўніцтва і садовых работ. Некаторыя гаспадарчыя прыстасаванні выкарыстаны і пры афармленні пляцоўкі. Вельмі добры маркетынгавы ход і выглядае незвычайна. Нездарма нават вясельныя картэжы заязджаюць, каб сфатаграфавацца на іх фоне. У наведвальніках наогул недахопу няма. Побач стадыён, дзе праходзяць спаборніцтвы па футболе.

— Нашы прадпрымальнікі малайцы, стварылі ўмовы і для шопінгу, і для адпачынку, а заадно за кошт уласных сродкаў добраўпарадкавалі вуліцу, — кажа Аляксандр Пузік. — Гэта тое, што называецца сацыяльна арыентаванай дзейнасцю.

## МАЛАКО НЕ ПАВІННА БЫЦЬ КІСЛЫМ

У сельскай мясцовасці існуе свая сістэма кантролю за парадкам. Тут ствараць камітэты тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання няма сэнсу, людзі і так ведаюць, дзе шукаць дэпутата — у сельсавеце. Узяць, напрыклад, аграгарадок Вяззе, да якога ад Асіповіч пяць кіламетраў. Будынак сельсавета знаходзіцца у самым цэнтры, з ім дзеляць плошчу пошта і банк, побач кантора калгаса, дом культуры, ФАП, камбінат бытавога абслугоўвання. Людзям зручна, калі ўсе неабходныя ім службы і арганізацыі сканцэнтраваны ў адным месцы.

> На інфармацыйных дошках — імёны і прозвішчы старшынь і іх памочнікаў, сярод якіх пенсіянеры, ветэраны, кіраўнікі арганізацый, актывісты ад народа.

У Аляксандра Пузіка для кожнага сельсавета заведзена асобная папка, дзе ён рэгулярна пазначае асноўныя паказчыкі дзейнасці.

— Форму я распрацаваў для сябе сам, у мяне тут інфармацыя і пра закуп малака, і пра продаж цялят, і пра работу сацыяльных дамоў, — кажа ён. — Адсочваем стан воінскіх пахаванняў, могілак, населеных пунктаў. Склаўшы ўсё гэта, мы маем аб'ектыўную карціну, хто працуе лепш, а хто горш. Ёсць сацыяльны пашпарт сельсавета, дзе зведзена ўся гэта інфармацыя. Дробязяў у нашай рабоце няма. Старшыні сельсавета да ўсяго павінна быць справа. І як аўталаўка працуе, і якой свежасці там прадукты. Калі хлеб чэрствы, гэта адразу ж будзе агучана. У аддаленых вёсках за такімі момантамі пільна сочаць старасты. Мы іх як можам падтрымліваем. Раз у квартал найбольш актыўных крышачку фінансава стымулюем. І людзі стараюцца. Перыядычна падводзім вынікі арганізацыйна-масавай работы і па кожным сельсавеце, а гэта стымул для старшынь. Сёлета па выніках працы за мінулы год лепшым у раёне і вобласці стаў Лапіцкі сельсавет. Гэта дало ім магчымасць атрымаць пераходны ганаровы сцяг, а таксама 500 базавых велічынь на вырашэнне надзённых праблем.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** zigulya@zviazda.by

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО

## «ДОРОЖНО-СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ № 3» –

продавец (организатор аукциона) 07 июля 2017 года проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества со снижением начальной цены на 20%

| № п/п | Сведения о предмете аукциона | Начальная цена предмета аукциона, бел. руб. | Место нахождения имущества | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| Лот №1 | Склад сланцевой золы, площадь 66 кв. м | 201809,56 | Могилевская область, Бобруйский р-н, южнее д. Ковали (в районе ст. Телуша) | 20180 |
| | Подъездной ж/д путь не общего пользования | | | |
| | Битумное хранилище, объем 640 тн | | | |
| | Битумное хранилище, объем 250 тн | | | |
| | Котельная | | | |
| | Бытовой корпус | | | |
| | Склад сланцевой золы, площадь 66 кв. м | | | |
| | Склад сланцевой золы, площадь 52 кв. м | | | |
| | Мазутная насосная | | | |
| | Ограждение из блоков к битумным емкостям | | | |
| | Здание для битумовара | | | |
| | Площадка из ж/б плит к КТП | | | |
| | Покрытие, площадь 1499 кв. м | | | |
| | Мастерская | | | |
| | Емкость, объем 60 м куб. | | | |
| | Емкость, объем 60 м куб. | | | |
| | Емкость, объем 50 м куб. | | | |
| | Емкость, объем 50 м куб. | | | |
| | Емкость, объем 2 м куб. | | | |
| | Нефтерезервуар, объем 4 м куб. | | | |
| | Емкость, объем 25 м куб. | | | |
| | Емкость, объем 25 м куб. | | | |
| | Битумоплавильня, объем 4*10 м куб. | | | |
| | Зеленые насаждения | | | |
| | Внеплощадные электрические сети | | | |
| | Верстак металлический | | | |
| | Канализационная сеть | | | |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел.: 23-64-24, 28-41-00.
